№№1—2
(2521—2522)

4 студзеня 2006 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!

Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 206-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 206-68-71.

...А пакуль — з Новым годам і Калядамі!

Шаноўныя сябры!

Прыхільнікі "Народнай волі"!

Адчуваю ўсімі фібрамі: у бліжэйшы тыдзень-другі я абавязаны буду звярнуцца да Вас са спецыяльным артыкулам. Тэма яго, адкрыю маленькі сакрэт, выспявае не ў рэдакцыі і не ў маёй галаве. Я толькі вымушаны буду яе агучыць, яе рэтрансляваць. Але пачакаем, пацерпім — і хутка многае, многае скажам...

А пакуль, мае мілыя, добрыя людзі, — з Новым годам Вас!

І, вядома ж, з Калядамі!

Апошняе віншаванне, як і першае, адрасуецца ўсім, усім, усім. І тым, хто адзначае святы па каталіцкім каляндары, і тым, хто робіць гэта па праваслаўных канонах.

Няхай цёплым светам поўняцца Вашыя душы...

Няхай сэрцы не ведаюць стомы ад радасных пачуццяў і хваляванняў, прыемных навін...

Няхай у год Чырвонай Свінні Вам пашчасціць з добрым прыплодам ва ўсіх зямных справах...

Мір Вашым дамам!

Дабрабыту — кожнай сям'і, кожнаму чалавеку!

Вы — з "Народнай воляй",
"Народная воля" — з Вамі!

Ваш
Іосіф СЯРЭДЗІЧ,
заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар газеты "Народная воля".

ВІНШУЕМ!

У падарунак дзве кватэры

Калі год таму мінчанка Алена Шамрэй падаравала мужу адразу чацвярых сыноў (наша газета распавядала пра гэта), то напярэдадні гэтага Новага года сям'я адсвяткавала наваселле.

Сям'і Шамрэй выдзелены на адной пляцоўцы адразу дзве кватэры — трох- і двухпакаёўка.

"Але ж гэта не бясплатна, — тлумачыць мне бацька сямейства **Чэслаў ШАМРЭЙ**. — *Зараз жа няма такога паняцця, каб далі жыллё бясплатна. 70 працэнтаў крэдыту выплачвае дзяржава, 5 працэнтаў — субсідыі, якія не трэба вяртаць, і 25 працэнтаў ад кошту кватэр нам трэба заплаціць самім на працягу дзесяці гадоў".*

Раней Алена і Чэслаў Шамрэі, іх шасцігадовы сын Міраслаў і чацвёра нованароджаных — Мацвей, Багдан, Ян і Пётр — жылі ў двухпакаёўцы. І калі год таму малым падаравалі 1760 памперсаў на 202 долары ЗША, то зараз, як бачым, навагодні падарунак больш значны.

Алесь СІВЫ.

SOS!

На Новы год беларускі фрыстайліст так і не прыйшоў у прытомнасць

Беларускі фрыстайліст Дзмітрый Рак, які яшчэ 10 снежня атрымаў на трэніроўцы ў Кітаі траўму галавы, да гэтага часу знаходзіцца ў коме.

— Траўму Дзіма атрымаў у другі дзень спаборніцтваў, на ранішняй размінцы, — расказаў карэспандэнту "Народнай волі" сярэбраны прызёр Алімпіяды-2006 фрыстайліст **Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ**, які прыехаў на навагодняя святы ў Мінск. — Быў звычайны скачок, было датыкненне да зямлі спінай і галавой пры прызямленні. Скажу шчыра, гэта самы звычайны скачок — 90 працэнтаў фрыстайлістаў так прызямляюцца. Праўда, за дзень да гэтага Дзмітрый Рак пры прызямленні ўдарыўся галавой яшчэ і аб калені, аднак пасля гэтага ён асабліва не скардзіўся, працягваў спаборніцтвы... Калі ж Дзіму забралі ў бальніцу, мы былі ўсе проста ў шокавым стане! Да гэтага часу не магу прыйсці ў сябе...

Нагадаю, што ўрачы паставілі беларускаму спартсмену дыягназ "унутрычарапная гематома". У кітайскай клініцы фрыстайлісту была аказана ўся неабходная дапамога, Дзмітрый быў пракансультаваны спецыялістамі.

Недзе праз тыдзень пасля здарэння стала вядома, што ў спартсмена ў спіннамазгавой вадкасці крыві не выяўлена, дыханне і гемадынамічныя паказчыкі стабілізаваліся, памеры гематомы паменшыліся на 60 працэнтаў.

А акурат напярэдадні Новага года галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра спартыўнай медыцыны **Яўген Ласіцкі** паведаміў у прэсе, што Дзмітрыю Раку па нацыянальным кітайскім методыкам робіцца ігларэфлексатэрапія, а ўрачы, якія працуюць са спартсменам, праходзілі стажыроўку ў Канадзе і Японіі. Гематома паменшылася да 20 працэнтаў, пастаянна праводзяцца сеансы ў баракамеры, падчас апошняга сеанса Дзіма некалькі разоў падымаў левую руку і шавяліў нагамі.

Перад Новым жа годам у кітайскую клініку за ўласныя грошы адправіўся да сына і бацька Дзмітрыя Рака Міхаіл Васільевіч...

— Муж тэлефануе мне кожны дзень, кажа, што сыну лепш, хоць у прытомнасць ён пакуль і не прыйшоў, — расказала ў мінулы аўторак маці фрыстайліста **Лідзія Аляксандраўна РАК.** — Урачы абяцаюць, што, магчыма, Дзіма выйдзе з комы паводле праз месяц пасля здарэння. Бацька паразмаўляў з сынам, кажа, што той усё разумее. Можа, дасць Бог, усё будзе добра...

Алесь СІВЫ.

«Ядзерны могільнік Беларусі не пашкодзіць»

Вынесеная ў загаловак фраза прагучала сапраўдны з вуснаў **Альгірдаса ВАЙДОНАСА**, намесніка дырэктара Агенцтва па абыходжанні з радыеактыўнымі адыходамі Літоўскай Рэспублікі ў час грамадскіх слуханняў па ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе могільніка радыеактыўных адыходаў, які Літва мяркуе пабудаваць паблізу мяжы з Беларуссю ў сувязі з канчатковым закрыццём у 2009 годзе Ігналінскай АЭС.

Застаецца дадаць, што слуханні адбыліся ў Браславе напярэдадні Новага года.

На ўсе вострыя пытанні ў Альгірдаса Вайдотаса былі падрыхтаваны адказы.

— У могільнік не будуць звозіцца адыходы з ўсяго ЕС, бо гэта катэгарычна забаронена законам нашай краіны, — патлумачыў літоўскі ядзершчык. — Могільнік разлічаны на 100 тысяч кубаметраў, і ў ім будуць пахаваны толькі адыходы Ігналінскай станцыі, а гэта — кароткажывучыя адыходы, перыяд распаду якіх — менш за 30 год. На сённяшні дзень патрабуюць пахавання 10—15 тысяч кубаметраў адыходаў, што знаходзяцца ў часовых сховішчах. Асноўная ж іх маса з'явіцца пасля канчатковага закрыцця Ігналінскай АЭС, якая цяпер уяўляе сабой значна большую небяспеку, чым той могільнік, які будзе пабудаваны згодна з сучаснымі стандартамі.

У дадатак да сказанага Вайдотасам, прадстаўнікі Літвы паабяцалі, што могільнік будзе размешчаны не за 700 метраў ад мяжы Браслаўскага раёна, як меркавалася раней, а значна далей, на пляцоўцы, што месціцца на тэрыторыі Ігналінскай АЭС.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

БУДЗЬ У КУРСЕ

Прыпынена дзеянне ліцэнзіі «Атам-Банка»

Да першага ліпеня прыпынена дзеянне агульнай і генеральнай ліцэнзій, а таксама ліцэнзіі на заахвочванне ва ўклады сродкаў фізічных асоб у ЗАА "Атам-Банк". Адпаведную пастанову прыняў савет дырэктароў Нацбанка. Прыпыненне дзеяння ліцэнзій у "Атам-Банка" выклікана невыкананнем ім нарматыву бяспечнага функцыянавання, а менавіта давядзення да мінімальнага памеру ўласнага капіталу банка.

С рэзідэнтамі свабоднай эканамічнай зоны, нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальным банкам і банкамі, якія зарэгістраваны на тэрыторыі нашай краіны, ён зможа ажыццяўляць валютна-абменныя аперацыі (уключаючы аперацыі на валютных біржах), а з рэзідэнтамі і нерэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь — валютна-абменныя аперацыі з удзелам фізічных асоб у абменных пунктах.

У межах ліцэнзіі ў "Атам-Банка" засталося права па вядзенні банкаўскіх рахункаў і ажыццяўленні разліковага ці касавага абслугоўвання насельніцтва.

Ад петард і феерверкаў пацярпелі дзевяць чалавек

Навагодняя ноч прайшла спакойна, паведамілі БелаПАН на Мінскай гарадской станцыі хуткай дапамогі.

Усяго за ноч паступіла 1810 выклікаў. "Для свята гэта зусім няшмат, іншым разам нават у звычайныя дні бывае больш", — сказала супрацоўніца станцыі. Частка выклікаў, паводле яе слоў, *"так ці інакш звязана з наступствамі перадазіроўкі алкаголю, некаторыя грамадзяне былі знойдзены ляжачымі на вуліцы".* Ад петардаў і феерверкаў пацяперлі дзевяць чалавек. Два з іх шпіталізаваны, астатніх адпусцілі дамоў пасля аказання неабходнай медыцынскай дапамогі.

Ірына ЛЕЎШЫНА.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Памятаецца, прайшла інфармацыя, што генеральнага дырэктара вытворчага аб'яднання "Мінскі аўтамабільны завод" Валянціна Гурыновіча прызначылі намеснікам міністра прамысловасці. Скажыце, калі ласка, а каго паставілі на яго месца? Што за чалавек, адкуль, дзе працаваў раней, можа, пайшоў на нейкія заводскія змены?

Іван Сідаравіч КАЛЕСНІКАЎ,
пенсіянер, ветэран працы.

Трэці месяц «МАЗ» без генеральнага дырэктара

Іван Сідаравіч!

Пакуль не можам адказаць на Ваша пытанне. Пайшоў трэці месяц, як Валянцін Аркадзьевіч Гурыновіч перайшоў на працу ў Міністэрства прамысловасці, а на яго месца да гэтага часу нікога не прызначылі. Калі шматтысячны калектыў аўтабудаўнікоў займее новага генеральнага дырэктара — цяжка сказаць. Але як толькі стане вядома, мы, паважаны чытач, вернемся да вашага пытання і падрабязна раскажам пра новага кіраўніка "МАЗа".

ТЕМА ДНЯ

Вячеслав ОРГИШ, доктор философских наук

«Газовая атака»,

или О том, почему стратегия Александра Лукашенко терпит фиаско

Газовая война отменяется. Так оценили наблюдатели и журналисты факт подписания российской и белорусской сторонами соглашения по газу за две минуты до наступления нового года. Однако, на мой взгляд, вопрос отнюдь не закрыт. Почему?

Белорусы, айда в землянки!

Пожалуй, впервые за многие годы белорусский режим потерпел стратегическое поражение. Разумеется, дело не только в том, что теперь Беларуси придется платить за российский газ вдвое больше. Сами по себе результаты схватки Москвы и Минска вокруг цены на газ нельзя расценить как проигрыш "Красного дома". Хотя, если брать во внимание только голую фактуру, то по итогам газовой схватки белорусская сторона, я считаю, имеет больше плюсов, чем российская.

В самом деле, россияне добились от Минска согласия платить за газ по сто долларов за тысячу кубов. Но все равно условия по поставке российского газа, зафиксированные в договоре, по словам главного менеджера Газпрома Алексея Миллера, самые льготные и самые выгодные на территории бывшего СССР. В том смысле, что ни одна из стран, которые покупают российское голубое топливо, не имела и не имеет таких льгот и таких выгод. Подняв еще в начале прошлого года тему цены на газ для Беларуси, российская сторона категорически заявляла о том, что цифра на ценнике не может быть ниже 200 долларов. Называлась даже цифра в 230 долларов. Но на финише переговоров Москва снизила планку своих притязаний до 110, а затем 105 долларов. Тем не менее Минск продолжал упорствовать и обвинять российских политиков в *"газовом"* шантаже. Посещая 30 декабря город Жлобин, Александр Лукашенко заявил журналистам: *"...В землянки пойдем, но на шантаж мы не поддадимся".* Первый вице-премьер белорусского правительства В.Семашко объявил о том, что Беларусь не согласится покупать газ по цене, превышающей 100 долларов. И, в конечном счете, Газпром принял условие Минска.

В результате последнее слово как будто осталось за "Красным домом". Тем более что Минск настоял на почти двойном повышении транзитных тарифов за газ (с 75 центов до 1,45 доллара), правда, неизвестно, какой процент из этой суммы будет возвращаться через тот же Газпром обратно в Россию. Также российская сторона в конце концов приняла белорусскую оценку стоимости Белтрансгаза, 50% акций которого, согласно достигнутой договоренности, выкупит российский газовый монополист. Газпрому пришлось признать, что белорусская часть газовой трубы стоит пять миллиардов долларов, то есть значительно больше той суммы, на которой первоначально настаивали россияне.

Казалось бы, Александр Лукашенко может записать в свой актив еще одну победу на восточном (российском) направлении своей внешней политики. Еще раз уведомить общественность, будто проводимый им курс *"эффективен и дальновиден".* Дело, однако, вовсе не в том, что россияне под занавес переговоров пошли на уступки белорусской стороне и тем самым дали А.Лукашенко возможность выглядеть если не чистым победителем, то лидером, который твердо держит в руках ситуацию и способен адекватно реагировать на вызовы.

Дело в том, что Кремль, пожалуй, впервые столь решительно атаковал и, как представляется, серьезно поломал стратегию белорусского *"вождя".* Суть этой стратегии до сих пор заключалась в том, чтобы экономическую политику Беларуси строить не на принципах рыночной конкуренции и свободного предпринимательства, а на слегка подновленной советской модели командно-административного регулирования хозяйственной жизни. А в качестве дешевого источника энергоресурсов (и, соответственно, дополнительного источника, частично покрывающего издержки недостаточно рентабельной экономики) использовать богатую нефтью и газом Россию.

Невольное саморазоблачение

Ответ на вопрос, каким образом использовать Россию, сообразительный Александр Лукашенко нашел, фигурально выражаясь, под лавкой. Почти так, как находили его в советское время партийные боссы союзных с Россией республик. Он провозгласил стратегический курс на интеграцию и строительство союзного государства с РФ. До поры до времени это срабатывало. Но с некоторых пор российский истэблишмент, одержимый идеей великодержавной реставрации, стал ставить вопрос ребром: господа белорусы, если хотите нас доить, пожалуйте в общее стойло.

До Александра Григорьевича приглашение, конечно же, дошло. Но дошло ли понимание того, что необходимо искать альтернативу неверно выбранному стратегическому курсу?

Во время все того же общения с избранными журналистами в городе Жлобине белорусский начальник был на удивление резок в оценках своих российских коллег. И вместе с тем абсолютно традиционен в толковании ситуации, к которой привел себя и страну; абсолютно привычен в жгучем желании переложить ответственность с больной головы на здоровую . *"...Это политика руководства Российской Федерации. Наверное, им не нужен тот союз, который был задуман изначально первыми президентами Беларуси и России. Но сегодня непопулярно заявить о том, что союз не нужен. Начали искать виноватых... Поскольку мы молчали, это приобрело разнузданную пропаганду. И начали обвинять белорусов, что мы не хотим никакого союзного государства и прочее. Но сейчас они показали себя во всей красе. Они понимали союз как вхождение Беларуси в Россию. Найдите хоть одно мое высказывание, хоть одно интервью, где я сказал, что мы вступим внутрь какого-то государства. Нигде не найдете... Мы за союз, но союз должен строиться на равноправной основе".*

С какой стороны ни посмотреть, и по форме, и по содержанию эти слова Александра Григорьевича — публичный крик отчаяния. И невольное саморазоблачение, из которого можно заключить следующее.

Во-первых, стратегический курс белорусского *"кормчего"* на интеграцию, строительство так называемого союзного государства с Россией, мягко говоря, не безупречен.

Во-вторых, Россия все же не дойная корова, а российские руководители не столько ностальгирующие по советскому прошлому романтики (как хотелось бы Александру Григорьевичу), сколько великодержавно мыслящие прагматики, которые за нефть и газ хотят получать реальную плату. Живыми деньгами и в размерах, которые диктует рынок. Или в виде натуры, которую в Кремле понимают не как *"равноправную интеграцию"*, а как отчуждаемую в пользу Российской Федерации белорусскую государственную независимость.

В-третьих, белорусский руководитель вольно или невольно пошел по стопам унтер-офицерской вдовы, которая, как известно, сама себя высекла. Многие обратили внимание на его пассаж: *"Найдите хоть одно мое высказывание, хоть одно интервью, где я сказал, что мы вступим внутрь какого-то государства. Нигде не найдете..."* Однако многим даже искать не пришлось, многие тут же вспомнили, как Александр Григорьевич в запале интеграционной риторики не раз подчеркивал: в объединении с Россией белорусская сторона готова идти настолько далеко, насколько готовы к этому россияне...

Газовый вопрос, ставший камнем преткновения во взаимоотношениях Беларуси и России, выявил ряд принципиальных моментов. Белорусский режим топчется в прошлом, его стратегия не рассчитана на то, чтобы строить в Беларуси современное европейское общество. Россия как главный продавец энергоресурсов для белорусской экономики, движимая собственными эгоистическими интересами, вольно или невольно начинает выступать катализатором постсоветской модернизации белорусского общества.

Дилемма «Красного дома»

Иначе говоря, прагматично настроенное российское руководство, несмотря на усиленную интеграционную риторику Минска, решило сломать статус-кво в российско-белорусских отношениях, которое давало односторонние выгоды белорусскому клиенту. Последние годы Беларусь получала газ по внутрироссийским ценам. Россия потребовала от Минска платить, как платят все прочие покупатели. "Красный дом" отбивался до последнего, стремился не просто выторговать минимальное повышение цен, но хотел сохранить прежние (внутрироссийские) тарифы. Уже после подписания газового контракта премьер-министр С.Сидорский сокрушенно заявил: *"...Согласились и подписали не выгодные для Беларуси условия поставки газа. В 2007 году это сто долларов. Это фактически увеличение для Беларуси стоимости газа с 46,68 доллара, которое мы имели в 2006 году, более чем в два раза".* Другими словами, для официального Минска выгоднее всего было бы оставить все, как прежде, или в крайнем случае платить за газ по 75 долларов.

Настояв на своем, Москва, образно говоря, вычеркнула Александра Григорьевича из списка льготных клиентов и предложила Минску играть по общим правилам, то есть по правилам рыночной конъюнктуры. На мой взгляд, именно последнее обстоятельство является для Александра Лукашенко самым болезненным и неприемлемым. По условиям подписанного контракта белорусской экономике дано несколько лет, чтобы перейти на условия мирового рынка. Сто долларов за тысячу кубов газа — это цена 2007 года. В дальнейшем, как пояснил представитель Газпрома, она будет исчисляться по формуле цены, которая применяется в российских контрактах для поставки газа в европейские страны. Переход к стопроцентной оплате будет для Беларуси поэтапным, растянется до 2011 года. Но он будет непременно.

Из этого следует ряд крайне неприятных для белорусской автократии вещей. Белорусское экономическое *"чудо"* ожидает пшик. Повышение цен на газ неизбежно увеличит себестоимость белорусских товаров и снизит их конкурентоспособность. Ненормально энергоемкое белорусское производство может утратить значительную часть своей широко разрекламированной рентабельности.

Перед "Красным домом" встает дилемма. Продолжать упорствовать в интеграционных играх и командно-административном управлении страной и, таким образом, еще дальше загонять себя в тупик, еще больше изолировать белорусское государство от Европы, превращать его в заложника России.

Или признать, что стратегический курс, доселе проводимый руководством Беларуси, не имеет внятной перспективы. И начать дрейф в сторону развития рыночных отношений, последовательного национального эгоизма, замешанного на традициях европейской хозяйственной культуры. Однако для этого белорусский режим должен отказаться от самого себя, политическая система страны должна претерпеть радикальную реформу, то есть перейти от автократии к...

Пока нет веских оснований утверждать, что Александр Лукашенко и его ближайшие соратники созрели для политической метаморфозы. Скорее наоборот. Это значит, что некоторое время официальный Минск будет пытаться эксплуатировать поломанную Кремлем стратегию белорусского *"кормчего".* Это значит также, что в обозримой перспективе белорусско-российский газовый конфликт в той или иной форме будет воспроизводиться.

Но образовавшуюся брешь в собственной стратегии Александру Григорьевичу уже не заделать.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Шмат гадоў мінула з таго часу, а я памятаю ўсё да дробязі. Мяне да глыбіні душы кранула заява Міхаіла Мікалаевіча Чыгіра, які вырашыў пакінуць пасаду прэм'ер-міністра, але не ўдзельнічаць у так званым рэферэндуме, вынікі якога цывілізаваны свет паставіў пад сумненне.

З-за сваёй прынцыповасці, я сказаў бы, з-за сваёй сумленнасці яму потым давялося прайсці праз турму. Такі ж лёс напаткаў і яго сына. Ды і іншым членам сям'і давялося нямала перажыць.

Хачу павіншаваць Міхаіла Мікалаевіча з Новым годам, Калядамі, але не ведаю яго каардынатаў. Можа "Народная воля" паведаміць...

Сцяпан МУРАЎСКІ, служачы. г.Мінск.

Прыміце віншаванні, Міхаіл Мікалаевіч!

Паважаны спадар Мураўскі!

Мы перадалі Вашыя віншаванні Міхаілу Мікалаевічу Чыгіру, які зараз працуе ў Маскве, займаецца сувязямі паміж Усходам і Захадам.

Гэты Новы год сям'я Чыгіроў была ў поўным зборы. Сын Аляксандр таксама выйшаў на волю, жыве і працуе ў Мінску.

Жонка Міхаіла Мікалаевіча — Юлія Станіславаўна займаецца хатнімі справамі. Шмат часу адымаюць у яе судовыя перыпетыі, якія не спыніліся да гэтага часу.

ЧУЛІ?

Алесь Пушкін адмяніў «Каляды ў Бабры»

У яго нарадзілася Марыся

Неяк пісьменік Уладзімір Арлоў слушна заўважыў, што нас, годных беларусаў, павінна быць болей. "Бо чым болей нас, тым менш іх (самі разумееце каго)".

Напярэдадні Новага года нас і сапраўды стала болей. У сям'і мастака-нонканфарміста Алеся Пушкіна нарадзілася дачка. Немаўля важыць 3,9 кг, а даўжыню мае — 54 см. Назвалі Марысяю.

З гэтай нагоды штогадовыя "Каляды ў Бабры", якія збіраюць у хаце Пушкіных вялікую колькасць гасцей з ўсёй Беларусі і замежжа, адмяняюцца. Алесь і Яніна будуць занятыя Марыськай. У сям'і таксама падрастае Міколка. А сяброў Пушкіны як заўжды чакаюць на Купалле.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ.

СКАНДАЛ?

Ляцяць навагоднія «утки»

Як паведаміла расійскае спартыўнае выданне "Спорт-экспресс" са спасылкай на сайт www.tuttobiciweb.com, экс-чэмпіёнка свету, пераможца жаночага "Тур дэ Франс" беларуска Зінаіда Стагурская затрымана італьянскай паліцыяй па абвінавачванні ў распаўсюджванні забароненых прэпаратаў.

Нагадаем, што веласіпедыстка зараз адбывае двухгадовую дыскваліфікацыю за ўжыванне допінгавага прэпарата станазалола.

Па паведамленні сайта, у выніку вобыску ў кватэры 35-гадовай спартсменкі знойдзена вялікая колькасць допінгу. *"Зараз перспектывы вяртання Стагурскай на шасэ ў 2007 годзе па заканчэнні тэрміну дыскваліфікацыі вельмі туманныя, паколькі ёй пагражае крымінальная адказнасць за захоўванне і распаўсюджванне допінгу, які, па італьянскіх законах, прыраўноўваецца да наркотыкаў"*, — піша сайт.

— Большай правакацыі я ўжо і не памятаю, — кажа карэспандэнту "Народнай волі" галоўны трэнер зборнай Беларусі па веласпорце **Алег ІВАНОЎ**. — Адразу ж пасля таго, як з'явілася гэтая інфармацыя, мы звязаліся з Зінаідай, якая апошнім часам жыве і трэніруецца ў Італіі, і пачулі, што ўсё гэта — няпраўда. Кажа: "Я зараз дома, і ў мяне наогул не было ніякіх стасункаў з мясцовай паліцыяй". Зрэшты, у Італіі такія "сенсацыі" — гэта норма, было б за што журналістам зачапіцца. Вось, напэўна, і выбралі аб'ектам для скандалу нашу Зінаіду Стагурскую, у якой, дарэчы, 7 чэрвеня гэтага года заканчваецца дыскваліфікацыя. Па маёй інфармацыі, яна ўжо знайшла каманду, за якую будзе выступаць, а да гэтага некалькі разоў стартавала ў ветэранскіх гонках, што не забаронена нават з дыскваліфікацыяй. Так што нікому не верце — са Стагурскай усё ў парадку.

Алесь СІВЫ.

Анатолий ЛЕБЕДЬКО, кандидат в депутаты Минского городского Совета по Машеровскому избирательному округу №41

ИМИТАЦИЯ

Почему в Беларуси выборы давно перестали быть площадкой здоровой конкуренции программ и команд тех, кто претендует на депутатский мандат

Почему власть так ненавидит избирателей?

Кое-кому мой вопрос покажется странным. Хотя, скажу сразу, я имею полное право именно на такую его постановку. Давайте углубимся в проблему...

В Беларуси с начала октября идет кампания по выборам в местные Советы. Но найти ее признаки — это большая удача. Примерно как услышать интервью оппонента власти на Белорусском телевидении, да еще в прямом эфире. А все потому, что избирательные кампании в Беларуси любят тишину и регламентацию. Благодаря этому большинство минчан, не говоря уже о жителях глубинки, даже не догадываются, что в стране проходят региональные выборы. И многие будут пребывать в таком же неведении и после 14 января, когда формально состоится голосование и в местные Советы придут "новые" прежние депутаты. Как всегда, на 99,9% согласованные и одобренные "батькиной" вертикалью.

Кандидат, собравшийся вне списка власти преодолеть избирательную дистанцию, должен принять во внимание, что самый распространенный знак на его пути — это знакомый каждому автолюбителю "кирпич". Это нельзя, то запрещено, это вроде бы и можно, но только в этом месте и исключительно в это время. К примеру, на территории всего Советского района столицы только в пяти закрытых помещениях можно встречаться с избирателями. Не больше! Пять мест для нескольких сотен тысяч людей. Такого нет ни в одной не то что европейской, а любой другой цивилизованной стране.

Минчанин, проживающий на территории Машеровского избирательного округа №41, как бы имеет право на встречу с кандидатом в депутаты, то есть со мной. Вот только ключевая фраза здесь "как бы". Как реализовать это право на практике? Встретиться мы можем только в актовом зале школы №27, что по улице Кропоткина, 74. И нигде больше. А что, спрашивается, делать тем, кто проживает на улице Берестянской? Только большой энтузиаст станет сначала давиться в переполненном общественном транспорте, а потом выискивать расположение той же школы №27 на местности.

Можно не сомневаться, что подавляющему большинству избирателей не суждено вживую увидеть кандидата — сторонника перемен. А человек без информации — это слепой без поводыря. Он не в состоянии сделать осознанный выбор. Таким нехитрым способом у избирателя отнимают мотивацию идти на избирательный участок: зачем ему голосовать за кота в мешке? Но это как раз то, что, на мой взгляд, и нужно власти. С арифметикой подсчета, как все знают, у нее полный порядок...

Если есть намерение пообщаться на открытом воздухе, то это тоже святое право белорусского избирателя. С одним исключением. Общение опять же может происходить исключительно там, куда указал перст власти. И не важно, что это может быть неудобно подавляющему большинству избирателей. Чем меньше соприкосновений "чужих" кандидатов с населением, тем спокойнее для власти. А то им только дай возможность поговорить!.. И теневой бюджет вспомнят, и исчезновение известных политиков, и незаконное переименование столичных проспектов, и неподготовленность страны к переходу на мировые цены на энергоносители, и многое-многое другое. А посему, товарищ Лебедько, можешь свою правду-матку рассказывать редким прохожим, выгуливающим своих питомцев в парке Бангалор. Именно там мудрый чиновник определил место для встречи с избирателями Машеровского округа №41. Если же я встречусь с минчанами где-нибудь во дворе дома на улице Кульман или Золотая Горка, то это уже правонарушение. И за общение, хоть себе с тремя пенсионерами, четко просматривается перспектива провести последующие 15 дней избирательной кампании в тюрьме на Окрестина. А на всю агитацию отводится всего-то месяц. Из которого добрая неделя уходит на праздничные гуляния.

После недельных переговоров и согласований с полутора десятками типографий выяснилось, что в столице нет возможности легально отпечатать информационные материалы кандидатов в депутаты от ОГП (с этой же проблемой столкнулись и кандидаты от других оппозиционных партий). Отказались помочь даже те, кто имеет хорошие личные отношения с переговорщиками от ОГП, и те, кто работал с нами прежде. До Нового года, т.е. за две недели до выборов, не были напечатаны листовки ни одного кандидата, на которые те по закону вроде бы имеют право. Руководители многих типографий не скрывают, что получили соответствующие указания от работников спецслужб. Так-так — спецслужб. Их у нас, оказывается, уйма.

Конечно, человеку со стороны может показаться, что подобные условия проведения выборов может предлагать только идиот. Но что в Литве или Словакии идиотизм, то у нас считается царством народовластия. Власть даже не скрывает, что в стране нет никаких выборов. Во многих регионах не создают даже видимости, даже имитации избирательного процесса. В том же Минске городские власти ответили отказом на мою заявку предоставить мне возможность встречаться с избирателями возле Комаровского рынка, в районе площади Якуба Коласа. Низ-зя! Запрещено! Такая вот у нас демократия. С явным привкусом презрения к гражданам Беларуси.

Ценники в наших магазинах и ресторанах заставляют иностранцев делать брови домиком. Если что еще и дешево в нашей стране, так это затраты на участников избирательной кампании. Беларусь — страна копеечных кандидатов в депутаты и таких же дешевых избирателей. На завоевание симпатий и голоса избирателя кандидату позволено потратить... аж 12 белорусских рублей. Это из расчета на одного человека. Прямое попадание в Книгу рекордов Гиннесса. Власть определила цену внимания и уважения к 21—23 тысячам избирателей столичного округа, которая меньше стоимости валютной проститутки. Простите за такое сравнение, но это исторический факт. Это отношение власти к нам с вами. Не через лощеную телевизионную картинку, а такое, какое есть в реальности.

Если применять другую терминологию, то происходящее — это полный абсурд. У людей в Великом княжестве Литовском прав было больше, нежели у нынешних белорусских избирателей. Давайте присовокупим к этому густо посеянное разочарование самими выборами. Шесть вечеров я провел в хождении по квартирам. Свидетельствую на Библии: власть убила веру людей в справедливые выборы. Наповал. Особенно после чистосердечного признания белорусского правителя, что итоги президентской кампании сфальсифицированы.

Шесть вечеров я потратил на поиски избирателя, который знает фамилию того, кто якобы представляет его интересы в Минском городском Совете. Не нашел ни одной семьи, ни одного человека, который бы назвал фамилию действующего депутата. Ни одного! Зато у власти нет никаких проблем с "назначенными" депутатами. Они молчаливы, послушны и управляемы. И становится совершенно понятно, почему власти не нужны выборы, честная конкуренция программ и кандидатов. Их задача — удерживать в руках, а не делиться с кем бы то ни было. Даже если этого желает большинство избирателей.

Дабы избежать всяческих недоразумений, счетчики голосов составлены исключительно из людей, зависимых экономически и политически от властных структур. Чужим здесь нет места. К примеру, Объединенная гражданская партия только в Минске предложила в состав избирательных комиссий 537 человек. Не включили ни одного. Все оказались не достойны миссии присутствовать при подсчете голосов. Ни бывший глава Центробанка, профессор Станислав Богданкевич, ни экс-министр Александр Соснов, ни депутаты Верховного Совета Александр Добровольский и Василий Шлындиков. Никто!

Фактически выборы в Беларуси отменены с середины 90-х годов прошлого столетия. Они перестали быть площадкой здоровой конкуренции программ и команд. Нет обновления власти — нет и новых идей. Система — как режимный объект. Она закрыта для людей, для прессы, для общественного контроля. То, что многим после первых президентских выборов в 1994 году представлялось чистой полноводной рекой, по прошествии 12 лет превратилось в болотистую местность. Здесь дурно пахнет, и всегда надо бояться провалиться и не достать ногами дна.

Пришло время менять ситуацию. И политическую кампанию под названием "Местные выборы" надо использовать, чтобы сказать людям об этом. Если власть так относится к избирателю, то она должна знать, что сама толкает его возвращаться на площадь, которую в народе уже нарекли именем Калиновского.

Кто и сколько будет платить за санаторную путевку

1 января 2007 года вступил в силу Указ А.Лукашенко "О санаторно-курортном лечении и оздоровлении населения". С этого дня путевки на санаторно-курортное лечение и оздоровление граждане Беларуси будут оплачивать в зависимости от получаемых доходов. При этом для гражданских и военных лиц определены равные условия платы за такую путевку.

Льготы на санаторно-курортное лечение и оздоровление будут получать только по состоянию здоровья, а не в силу статуса.

Размер платы за путевку будет определяться отношением размера денежного дохода получателя путевки к начисленной среднемесячной заработной плате работников Беларуси. Так, при доходе до 0,5 данной величины человек будет оплачивать 15% стоимости путевки в зимний период (с 1 ноября по 30 апреля) и 20% — в летний (с 1 мая по 31 октября). При доходах от 0,5 до 1 начисленной среднемесячной зарплаты по стране — соответственно 20% и 30%, от 1 до 1,5 — 30% и 40%, от 1,5 до 2 — 40% и 55%, от 2 до 3 — 50% и 70%, от 3 до 4 — 60% и 80%, от 4 до 5 — 85% и 90%. А те граждане, чей доход превышает 5 таких величин, будут приобретать путевку за полную стоимость вне зависимости от сезона.

Указом отменяется денежная компенсация за неиспользованную санаторно-курортную путевку и устанавливается денежная помощь на оздоровление. Право на получение такой помощи в размере 10 базовых величин (на сегодняшний день это 310 тыс.рублей) будут иметь Герои Беларуси, Герои Советского Союза, Герои Социалистического Труда, полные кавалеры орденов Отечества, Славы, Трудовой Славы, инвалиды и участники Великой Отечественной войны, а также лица, приравненные к ним. По их желанию вместо денежной помощи им может предоставляться внеочередная бесплатная путевка на санаторно-курортное лечение.

Как сообщил корреспонденту БЕЛТА заместитель директора Республиканского центра по оздоровлению и санаторно-курортному лечению населения Геннадий Болбатовский, документация по учету нуждающихся в санаторно-курортном лечении неработающих пенсионеров и инвалидов передана из органов по труду и социальной защите в территориальные представительства центра.

Он пояснил, что в соответствии с указом №542 с 1 января 2007 года предоставлением путевок для всех категорий граждан, в том числе для неработающих пенсионеров и инвалидов, будет заниматься Республиканский центр по оздоровлению и санаторно-курортному лечению населения. Поэтому неработающие пенсионеры, желающие получить путевку (безусловно, если они имеют медицинские показания к санаторно-курортному лечению и не имеют противопоказаний), должны обращаться в территориальные структуры этого центра, а не в органы по труду и соцзащите, как было раньше. Геннадий Болбатовский особо подчеркнул, что очередность на получение путевок в здравницы сохранена.

Олег СНОВ.

ПРЫВАТНАЕ ЖЫЦЦЁ

"Народная воля" пацікавілася, як сустракалі Новы год жонка былога гендырэктара Мінскага трактарнага завода Алена Лявонава і ўдава гвалтоўна знішчанага тэлеаператара Дзмітрыя Завадскага Святлана Завадская.

Алена ЛЯВОНАВА: «Муж не губляе аптымізму...»

Былому дырэктару МТЗ **Міхаілу Лявонаву** дазволілі пераднавагодняе пазачарговае спатканне з жонкай.

"Мы былі вельмі задаволеныя, бо менавіта ў гэтыя дні быў мой дзень народзінаў, — гаворыць Алена Георгіеўна. — *Таму і я, і муж былі вельмі шчаслівыя. Мы чакалі гэтай сустрэчы. І тое, што яна адбылася, стала, бадай, адным з самых найлепшых падарункаў на Новы год.*

Муж выглядае, калі так можна сказаць, нармальна. Ён не падае духам і не губляе аптымізму".

Дарэчы, у маі гэтага года Міхаіл Лявонаў можа быць умоўна-датэрмінова вызвалены.

Святлана ЗАВАДСКАЯ і Сяржук БАХУН: «Галоўнае, каб побач былі блізкія людзі...»

"Для нас Новы год — свята сямейнае, — гаворыць Святлана. — Таму мы нават не сумняваліся, што будзем сустракаць гэтае свята ў атачэнні блізкіх людзей".

"Разам са Свецінымі мамай і татам мы паехалі да маіх бацькоў у Брэст, — далучаецца да размовы Сяржук Бахун, муж Святланы. — За вялікім сталом сабралася вялікая сям'я з дзесяці чалавек, а пад ёлкай было шмат падарункаў.

Для нас са Светай гэта была добрая нагода пабыць у сямейным коле, бо мінулыя гады, асабліва для Светы, былі цяжкім выпрабаваннем адзінотай. Мінулы, 2006, год мы са Святланай правялі разам і ўпершыню за доўгія гады не адчувалі самотны. Амаль кожны дзень мы былі побач і цанілі кожную хвіліну. Для нас было вельмі важна, што ў гэты дзень з намі былі нашыя блізкія людзі, якіх мы любім і цэнім, а яны любяць нас. Таксама мы са Святланай атрымалі шмат віншаванняў і добрых пажаданняў.

Кажуць, як сустрэнеш Новы год, так яго і правядзеш. Таму мы хочам, каб мы былі разам як мага больш і побач з намі былі нашыя родныя людзі і сябры.

Мы хочам пажадаць усім беларусам увесь час быць разам з блізкімі людзьмі і шчырымі сябрамі. А нашай Радзіме Беларусі мы жадаем усе наступныя гады сустракаць у адзінай агульнаеўрапейскай сям'і і не адчуваць сябе чорнай дзіркай на мапе Еўропы".

Марына ВІШНЕЎСКАЯ.

СУД

Грошай не хапала? Дзяржава пакорміць!

Судом Ашмянскага раёна за атрыманне хабару і злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі на 12 гадоў пазбаўлення волі асуджаны былы начальнік мясцовай інспекцыі па падатках і зборах па Смаргонскім раёне. Прыгавор уступіў у законную сілу, паведамілі ў рэспубліканскай пракуратуры.

Папярэдняе расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да чыноўніка праводзілася следчым аддзелам пракуратуры Гродзенскай вобласці. Устаноўлена, што ён, выкарыстоўваючы свае службовыя паўнамоцтвы, садзейнічаў заключэнню фіктыўнага дагавору паміж прадпрымальнікамі, грашовыя сродкі ад якога ў суме звыш за 5 млн рублёў былі зрасходаваны на рамонт кватэры сына ў Мінску.

Акрамя таго, былы кіраўнік раённай ІМПЗ у адпаведнасці са сваімі службовымі паўнамоцтвамі наклаў арышт на прадукцыю аднаго з адкрытых акцыянерных таварыстваў на суму больш як 704 млн рублёў. Па рашэнні Гаспадарчага суда Гродзенскай вобласці гэтая прадукцыя была накіравана ў даход дзяржавы. Потым, маючы карысныя мэты, ён дабіўся ўцэнкі арыштаванай прадукцыі на 70 млн рублёў і заключэння дагавору аб яе продажы прыватнаму прадпрыемству без перадаплаты.

За ўчыненне названых дзеянняў былы начальнік падатковай інспекцыі атрымаў хабар у суме 18 тыс. долараў ЗША, з якіх 2600 долараў ЗША аддаў пасрэдніку. У момант атрымання ўзнагароджання ён і быў затрыманы.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

«Беларускага Карэліна» падвёў почырк...

Вядомы спартсмен з Віцебска, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў 1980 года ў Маскве, двухразовы чэмпіён свету і чатырохразовы чэмпіён Еўропы па грэка-рымскай барацьбе Ігар Каныгін вылучаўся кандыдатам у дэпутаты Віцебскага аблсавета. Аднак заслужаны майстар спорту не прайшоў этап рэгістрацыі кандыдатаў.

У акруговай выбарчай камісіі па Гагарынскай акрузе № 46 у Віцебску палічылі, што ён прадаставіў недакладныя звесткі пра сябе ў беларускамоўнай анкеце, якую запоўніў не сам. Каб устанавіць гэта, выбарчая камісія прызначыла почырказнаўчую экспертызу.

У графе "Пасада" Ігар Каныгін указаў месца працы, а не сваю пасаду. Зараз ён працуе ў школе вышэйшага спартыўнага майстэрства старшым трэнерам па вольнай барацьбе зборнай Віцебскай вобласці.

"Прадстаўнікам выбаркама я адразу ж сказаў, што не ведаю добра беларускую мову. Я не ўтойваў і таго, што анкету за мяне запаўняў іншы чалавек: і мовы не ведаю, і почырк у мяне непрыгожы, і пісаць цяжка ад атрыманых спартыўных траўм. Тым не менш выйшла памылка — пераблыталі пасаду з месцам працы. Я думаю, для членаў камісіі гэта стала зачэпкай, каб адмовіць мне ў рэгістрацыі. Хутчэй за ўсё гэта было "замаўленне", калі непажаданыя людзі адсейваюцца. Мне здаецца, ім там не патрэбны кандыдаты, якія, у выпадку чаго, не будуць маўчаць. Але нічога, я ад гэтага толькі мацнейшым стану — і ў спорце, і ў грамадскім жыцці", — сказаў у інтэрв'ю БелаПАН Ігар Каныгін.

У скарзе, якую спартсмен падаў у абласную тэрытарыяльную выбарчую камісію, гаворыцца: *"У гэтым выпадку не было неабходнасці з боку акруговай выбарчай камісіі Гагарынскай выбарчай акругі №46 прызначаць почырказнаўчую экспертызу анкеты і браць заключэнне экспертна-крыміналістычнага цэнтра УУС Віцебскага аблвыканкама, бо я не адмаўляў факта, што яе запоўніў нехта іншы. У той жа час звяртаю вашу ўвагу на тое, што ў гэтым выпадку акруговая камісія перавысіла свае паўнамоцтвы пры прызначэнні почырказнаўчай экспертызы, таму што Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь такіх паўнамоцтваў для яе не прадугледжана"*.

Варта адзначыць, што ў выніку кандыдатам у дэпутаты ў Віцебскі аблсавет па Гагарынскай выбарчай акрузе №46 зарэгістравана дырэктар абласной філармоніі Алена Падаляк. І ўсё... Выбары будуць праходзіць на безальтэрнатыўнай аснове.

У Віцебску штогод праходзіць міжнародны юнацкі турнір па грэка-рымскай барацьбе на прызы Ігара Каныгіна. У 2006 годзе турнір адбыўся ў 11-ы раз. Спартыўныя выданні называюць віцебскага барца "беларускім Карэліным".

Таццяна ЧАБАТАРОВА.

ДАРЭЧЫ

Адмовіўся...

Сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Мікалай Коўш, які быў зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты ў Брэсцкі абласны і гарадскі Саветы, вырашыў не ўдзельнічаць у выбарчай кампаніі.

У сваёй заяве ў выбарчую камісію спадар Коўш патлумачыў, што адмаўляецца ад далейшага ўдзелу ў гэтай кампаніі *"ў сувязі з тым, што адсутнічаюць умовы для правядзення свабодных, празрыстых і сумленных выбараў"*.

ЭФІР

Вот и НТВ не осталось

С первого января 2007 года изменен социальный пакет программ, предоставляемый телезрителям операторами кабельного телевидения. Вместо ретранслируемого российского телеканала НТВ в обязательном порядке войдет его белорусский вариант "НТВ-Беларусь".

Как сообщил директор СП "Кабельное телевидение" **Виктор Дударчук**, все операторы кабельного телевидения уже получили соответствующее распоряжение Министерства информации.

Напомним, что некоторое время назад Белтелерадиокомпания выкупила у НТВ право ретрансляции канала на территорию Беларуси, а также возможность размещения на нем программ и рекламы белорусского производства. По аналогичной схеме на базе "Первого" российского канала было создано ОНТ.

Лилия ВОРОНОВА.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

АФІЦЫЙНА

Беларусь будзе прасіць у Расіі стабілізацыйны крэдыт

Міністэрства фінансаў Беларусі гатова ў выпадку неабходнасці да карэкціроўкі закона аб бюджэце на 2007 год у сувязі з павышэннем цэн на расійскі газ. Пра гэта паведаміў намеснік міністра фінансаў Беларусі Ула дзімір Амарын.

Ён адзначыў, што бюджэт краіны на 2007 год разлічаны на падставе прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця, які быў зроблены Мінэканомікі ў ліпені-жніўні 2006 года. Галоўны фінансавы дакумент прадугледжваў павышэнне цэн на газ не больш як на 15%. *"Натуральна, там нейкія варыянты цэн на нафту ў сувязі з увядзеннем расійскіх пошлін на нафту не ўлічваліся. Але мы гатовы да таго, што карэкціроўкі ў расходнай і даходнай частцы бюджэту будуць зроблены"*, — сказаў У.Амарын. Паводле яго слоў, пралічаны таксама розныя варыянты карэкціроўкі бюджэту ў сувязі са зніжэннем даходаў ад паступлення падаткаў на прыбытак. У Мінфіне прызнаюць, што прыбытак ад нафтаперапрацоўкі ў краіне можа знізіцца.

У.Амарын таксама паведаміў, што Міністэрства фінансаў плануе выкарыстаць частку сродкаў Фонду нацыянальнага развіцця ў выпадку карэкціроўкі бюджэту. Паводле яго слоў, на канец гэтага года памер фонду складае каля 1,2 трлн рублёў. Нагадаем, што гэты фонд фарміраваўся сёлета за кошт абавязковага адлічэння часткі прыбытку высокарэнтабельных дзяржпрадпрыемстваў.

Намеснік міністра фінансаў таксама адзначыў, што Беларусь пакуль не плануе прыцягваць расійскі стабілізацыйны крэдыт. *"Па стабілізацыйным крэдыце пакуль дамоўленасцяў няма"*, — сказаў У.Амарын.

Ул.інф.

Нацбанк абвяргае

У сувязі са шматлікімі зваротамі грамадзян у галоўную банкаўскую ўстанову краіны і банкі Нацыянальны банк Беларусі паведамляе, што ў 2007 годзе правядзенне дэнамінацыі беларускага рубля не плануецца. Пра гэта гаворыцца ў прэс-рэлізе Нацбанка.

Нацыянальны банк абяцае "прыкласці ўсе намаганні, каб усе паказчыкі Асноўных накірункаў грашова-крэдытнай палітыкі Рэспублікі Беларусь на 2007 год былі выкананы". Як вядома, гэтым дакументам прадугледжана змяненне афіцыйнага курса беларускага рубля адносна долара ЗША ў межах плюс/мінус 2,5 працэнта на 1 студзеня 2008 года.

Ул.інф.

ПРЫГАВОР

Барацьбіт са злачыннасцю атрымаў дзесяць гадоў

Былы першы намеснік начальніка Упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі МУС Беларусі, былы палкоўнік міліцыі Клімянкоў будзе адбываць пакаранне ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Паводле інфармацыі рэспубліканскай пракуратуры, суд прызнаў былога палкоўніка міліцыі вінаватым ва ўчыненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 1 арт. 424 (злоўжыванне ўладай або службовымі паўнамоцтвамі) і ч. 3 арт. 430 (атрыманне хабару) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Клімянкоў асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі ў папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму з пазбаўленнем права займаць пасады ў праваахоўных органах на 5 гадоў.

Падчас расследавання крымінальнай справы, праведзенага рэспубліканскай пракуратурай, а таксама судовага следства сабраны доказы ўчынення падбухторвання, пасрэдніцтва і дачы хабару ў дачыненні да яшчэ пяці чалавек, якія таксама асуджаны да розных тэрмінаў пазбаўлення волі — ад 6 да 8 гадоў.

Па прыгаворы суда да ўсіх абвінавачаных прыменена такая мера, як канфіскацыя маёмасці, а таксама з іх спагнаны ў даход дзяржавы грашовыя сумы, атрыманыя ад злачыннай дзейнасці.

Вячаслаў БУДКЕВІЧ.

ЦУДЫ

Плата за кватэру застанецца ранейшай?

Кошт жыллёва-камунальных паслуг у 2007 годзе павялічыцца не больш як на 5 долараў. Пра гэта 2 студзеня паведаміў журналістам першы намеснік міністра энергетыкі Эдуард Таўпянец. Па яго словах, Міністэрства энергетыкі будзе выносіць прапанову ўраду, каб пакінуць нязменным той калідор росту цэн на паслугі ЖКГ, які быў зацверджаны ў мінулым годзе. Вось такія дзівосы часам адбываюцца з эканамічнымі разлікамі!

Ул.інф.

ТЭМА ДНЯ

Леанід ЗАІКА, прафесар:

«Трэці прэзідэнцкі тэрмін Лукашэнкі беларусы аплацяць з уласнай кішэні...»

Афіцыйны Мінск спрабуе адыграць назад рашэнне Крамля, якім з 1 студзеня 2007 года ўведзены экспартныя пошліны на сырую нафту і нафтапрадукты.

*Эканаміст **Леанід ЗАІКА** заўважае: маўляў, Масква толькі задэкларавала ўвядзенне экспартных пошлін на нафту, а на практыцы гэтая схема можа і не спрацаваць. Але калі Расія рэальна ўвядзе экспартныя пошліны, гэта стане для беларускай эканомікі сапраўдным накаўтам: Беларусь згубіць 3,5 мільярда долараў пры сукупным валавым унутраным прадукце ў 30 мільярдаў долараў. Большага ўрону нельга было чакаць нават ад "ненавісных" янкаў.*

Цяперашні бясслаўны перыяд беларуска-расійскай інтэграцыі спецыяльна для "Народнай волі" аналізуе Леанід Заіка.

«Як дзяўчаты дазваляюць сябе любіць, так і Расія дазваляла прадаваць прадукты перапрацоўкі сваёй нафты...»

— Сітуацыя была простая: лаяльнасць да Расіі з'яўляецца мерай эканамічнай, — гаворыць Заіка. — Расія можа плаціць і плаціла за лаяльнасць ці дружбу, самую моцную дружбу на прасторах СНД. Сусветная практыка сведчыць, што паўтара—два мільярды — невялікая і сціплая цана за падтрымку.

Удача да апошняга часу была на баку Лукашэнкі. Ён ўмела схіляў да такіх паводзін і Ельцына, і Пуціна. Але калі Лукашэнка вырашыў ісці на трэці тэрмін, абсалютна ігнаруючы стрыманыя парады Пуціна, правілы гульні сталі мяняцца. Дрэнна тое, што сама Беларусь, усе мы сталі заложнікамі гэтай гульні, дакладней, стратэгіі.

Беларускія эксперты даўно казалі, што Расія субсідзіруе Беларусь. Але ўзнікае лагічнае пытанне: каго канкрэтна субсідзіруе — краіну ці яе кіраўніка? Краіну, каб падтрымаць аднаго палітыка.

У беларускага кіраўніцтва, у дадатак да ўсяго, хапіла дурноты аб'явіць вынікі эканамічнага развіцця *"беларускім цудам"*, а пра Лукашэнку сталі гаварыць як пра добрага гаспадарніка. Пуціну цяжка было падавіць спакусу паказаць, які гэта *"добры гаспадарнік"*.

Расія разглядала тры варыянты ўздзеяння на беларускае кіраўніцтва. Сцэнарый першы — гэта, канечне, убраць усе даходы, не зробленыя нацыянальнай эканомікай, усё тое, што з'яўлялася бонусам.

Сцэнарый другі — увесці высокія тарыфы на прыродны газ, што выклікае пастаянны няўмольны рост запазычанасці па аплаце за газ і ў рэшце рэшт вядзе да таго, што Беларусь аддасць *"фамільнае серабро"* за гэты доўг. Ва Украіне, Грузіі, Арменіі так і адбываецца. Схема надзвычай простая і эфектыўная.

Трэці варыянт — увесці абмежаванні на расійскім унутраным рынку — па якасці, па інтэлектуальнай уласнасці. Першая пазіцыя ў гэтым спісе — нафта, затым — газ, а далей — велізарны выбар з сегментаў рынку: цукар, малочныя прадукты, кандытарскія вырабы. Усе гэтыя спосабы можна ўжываць адначасова, а можна толькі адзін.

Самая сур'ёзная пагроза з усіх пералічаных — нафта. Нафтапрадукты сталі, можна сказаць, галоўным сімвалам *"эканамічнага цуду"* Беларусі. У 2006 годзе Беларусь прадала нафтапрадуктаў, вырабленых з расійскай нафты, прыкладна, на 6 мільярдаў долараў (агульны валавы ўнутраны прадукт складае 30 мільярдаў долараў). Прычым такое становішча склалася вельмі хутка — літаральна цягам трох апошніх гадоў. Расія летась зарабіла на продажы зброі прыкладна столькі ж — 6 мільярдаў, больш чым калі-небудзь, гэтым вельмі ганарыцца Пуцін. Але на гэтую суму працаваў увесь расійскі ваенна-прамысловы комплекс з яго найноўшымі тэхналогіямі, касмічная сфера, нана-тэхналогіі — усё найноўшае і самае сучаснае. Што зарабіў расійскі ВПК за год — тое ж самае Беларусь зарабіла літаральна з паветра. Як дзяўчаты дазваляюць любіць сябе, так і Расія дазваляла прадаваць прадукты перапрацоўкі сваёй нафты.

Я выступаў на Савеце па знешняй абароне Расіі і звяртаў увагу на тое, што геаэканоміка мяняецца. 50% беларускага экспарту ідзе ў краіны Еўрапейскага Саюза, і толькі 32% — у Расію. На словах адбываецца інтэграцыя, на справе ж Беларусь гандлюе прадуктамі нафтаперапрацоўкі праз Вялікабрытанію, праз Галандыю. І гэта палова ўсяго беларускага экспарту!

«Танней акажацца запраўляцца ў Расіі...»

— Чаму Расія выказалася за самы радыкальны варыянт — увядзенне экспартных пошлін?

— Увядзенне экспартнай пошліны азначае, што пры вывазе кожнай тоны нафты беларускі ўрад мусіць плаціць падаткі. Урад са скуры лезе, каб садраць падаткі з прадпрымальнікаў, дый нават з простых грамадзян. Але калі размова заходзіць пра сам урад, то яму, аказваецца, можна не плаціць 3,5 мільярда долараў у расійскую казну ў якасці падаткаў. Усё гэта называецца проста: несумленная гульня. Можна было проста ініцыяваць перамовы і заявіць расіянам прама: мы прэтэндуем на гэтыя грошы...

Па вялікім рахунку, экспартная пошліна — рэнтны плацеж, які ўзнікае толькі тады, калі цэны на нафту зашкальваюць.

Гаворка сапраўды ідзе пра вялікія грошы. Цана пытання — 3 мільярды 600 мільёнаў долараў, якія не патрапяць у чыесьці кішэні. Няўжо нельга было знайсці мільярд, максімум 2 мільярды долараў і эфектыўна спансіраваць ціск на Крэмль?! Сквапнасць, няўменне і нерасторопнасць згубілі людзей.

Можна вылучыць такую версію: гэтыя 3 мільярды не ідуць і не ішлі ў бюджэт — той бюджэт, з якога падкормліваецца электарат Лукашэнкі: пенсіянеры, бюджэтнікі, іншыя малазабяспечаныя катэгорыі насельніцтва. Гэтыя грошы дзеляць паміж сабой расійскія алігархі, беларускае чынавенства, палітыкі, лабісты. Вось чаму так востра ўспрынята ўвядзенне Расіяй экспартных пошлін на сырую нафту і нафтапрадукты.

Ёсць спосабы, як пісаў Энгельс, законы ажыццяўляць праз іхняе неажыццяўленне. Увядзенне пошлін — гэта частка праблемы, удар па напаўкрымінальных, лабісцкіх групоўках, якія жывуць на нафтавай трубе.

Больш цяжкія наступствы магло прынесці кваціраванне паставак нафты. Раздаваліся галасы абмежаваць пастаўкі нафты патрэбамі нацыянальнай эканомікі: трэба Беларусі 10 мільёнаў тон для ўнутраных патрэб — Расія пастаўляе 10 мільёнаў тон, і ні тоны болей. І пошліны ўводзіць не трэба. Але гэта быў бы куды мацнейшы ўдар па эканоміцы: заводы перайшлі б на галодны паёк, заробкі істотна зменшыліся б, даходы насельніцтва ўпалі б у два разы.

— Што губляе Беларусь пры ўвядзенні экспартных пошлін?

— Арыфметыка простая. Летась Беларусь купіла каля 20 мільёнаў тон расійскай нафты. Тона нафты каштуе 271 долар ЗША. Калі дадаць да гэтай цаны экспартную пошліну ў 180 долараў — цана тоны нафты з экспартнай пошлінай павялічваецца да 450 долараў. Барэль адпаведна каштуе 75 долараў — гэтая цана вышэйшая за сусветныя расцэнкі. Але за такія кошты купляць нафту ў Расіі няма сэнсу. Танней купляць нафту ў Азербайджане, Казахстане і дастаўляць яе ў Беларусь. Але сувязі з Расіяй наладжаныя, і пры разрыве сістэмных сувязяў нафтаперапрацоўчыя заводы проста стануць на месяц—два. Гіпатэтычна такая сітуацыя магчымая.

Купляючы нафту ў Расіі за 75 долараў за барэль, мы аўтаматычна падымаем кошты на бензін на 20 цэнтаў за літр, ці на 400 рублёў. А ў гэтым выпадку танней акажацца ездзіць і запраўляцца ў Расію, у тую ж Смаленскую вобласць.

«Калі б не трэці тэрмін...»

— Афіцыйная статыстыка сведчыць, што 85% усіх энергарэсурсаў Беларусь імпартуе, прычым закупляе ў аднаго пастаўшчыка — Расіі. Афіцыйны Мінск прызнаў, што такая сістэма нявыгадная як з тэхнічнага пункту гледжання, так і з эканамічнага.

— Так. Штомесяц Беларусь закупляе на 613 мільёнаў долараў паліва, нафту і нафтапрадукты, і бярэ гэтыя прадукты ў Расіі. З усяго астатняга свету купляецца толькі на 5 мільёнаў долараў. Нафтапрадукты, такія як машыннае масла, іншыя кампаненты, закупляюцца ў 12 краінах свету, нават у ЗША, але гэта абсалютна нікчэмная, мізерная доля.

Газ імпартуецца на 100 працэнтаў. І толькі з Расіі.

У мінулым годзе пакупка каменнага вугалю знізілася амаль на 30% і склала каля 5 тысяч тон у месяц. Мізер. Гэта ёсць праблема дыверсіфікацыі імпарту, гаворка пра якую ідзе з пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

У Аляксандра Рыгоравіча існавала ўпэўненасць, што ўдасца трымаць сітуацыю пад кантролем. І я пераканаў: калі б не яго трэці прэзідэнцкі тэрмін, гэтай праблемы ў Беларусі не было б і ў паміне! Калі б хоць Лукашэнка паказаў, што рыхтуе пераемніка!.. Але Лукашэнка пераацаніў свае магчымасці. Гэта чорная метка: Крэмль будзе сачыць за рэакцыяй беларускай эліты і рэагаваць на рэакцыю, даруйце за таўталогію.

— Электраэнергію Расія адмовілася пастаўляць, на нафту ўвяла экспартныя пошліны, і невядома, ці адменіць. Якія перспектывы Беларусь мае ў газавай сферы?

— Калі па нафце ў нас не было ніякіх козыраў, то па газе — іншая рэч: можна было таргавацца з-за трубы. Лукашэнку, у прынцыпе, не хапіла часу, не хапіла літаральна трох-чатырох месяцаў, каб дажыць, дацягнуць да красавіка. Там у Расіі пачынаюцца прэзідэнцкая кампанія, думскія выбары, і ў выбарчай мітусні беларускаму кіраўніцтву магло б усё сысці з рук.

Паглядзім у апошнія «жыроўкі»

— Падсумуем тое, што маем...

— Аляксандр Лукашэнка ўжо не можа разлічваць на фінансавую падтрымку. Калі раней ён мог прыкрываць *"простых беларусаў"* нізкімі тарыфамі і цэнамі, то цяпер гэтаму канец. Праведзеная ў краіне газіфікацыя, асабліва на вёсцы і ў чарнобыльскай зоне, дасць адваротны эфект: з-за дарагавізны газу людзі стануць мяняць газавыя калонкі на традыцыйныя вясковыя печы і дровы. Газ — надзвычай дарагое паліва.

Глядзіце: за 1 гігакалорыю газу жыхары еўрапейскіх краін плацяць прыкладна 10 еўра. Самы танны газ у Эстоніі — 1 гігакалорыя каштуе 4 еўра. Што ў Беларусі? Возьмем апошнія "жыроўкі" і паглядзім графу "падагрэў вады". У мяне гэтая сума складае 32 тысячы 460 рублёў, ці 11 еўра. І атрымліваецца: хай мы да апошняга часу і за 46 долараў куплялі газ у Расіі, але пакуль паліва дойдзе па ржавых трубах да спажыўца — цана газу неймаверна вырастае. А таму для беларускага спажыўца газ абыходзіцца даражэй, чым для сярэднееўрапейскага ўжо цяпер.

— Многія гадаюць: які чарговы ўдар можа нанесці Расія па Беларусі? Якіх сюрпрызаў варта чакаць беларусам з Усходу?

— Пакуль што і гэтага дастаткова. Нафта давала магчымасць штомесяц перагандлёўваць ЕС на 428 мільёнаў долараў. Цяпер людзі адчуюць удар. Гадавая інфляцыя можа вырасці да 15—20%, 25 працэнтаў прадпрыемстваў стануць стратнымі... Бізнес адчуе, што заказчыкі, якімі выступаюць дзяржаўныя структуры, не ў стане разплаціцца за здзелкі, і таму дробнаму бізнесу прыйдзецца вельмі цяжка.

Можна чакаць, што з'явіцца дэфіцыт бензіну. А можа стацца і так, што самы танны бензін будзе на запраўках "Лукойла", а на астатніх запраўках яго ўвогуле не будзе. У гэтым выпадку "Лукойл" можа скупіць усю сетку рознічнага продажу бензіну. Гэта значыць, што трэці прэзідэнцкі тэрмін Лукашэнкі беларусам давядзецца аплаціць з уласных кішэняў...

Еўрапейскі Саюз ніколі не рашыўся б на падобныя санкцыі. Таму ў адносінах да цяперашняй беларускай улады Крэмль ператварыўся ў пагрозу №1, а Еўрасаюз стаў нават ці не партнёрам...

Гутарыў Юрась ДУБІНА.

ДАСЬЕ

ЗАІКА Леанід Фёдаравіч, 1948 года нараджэння. Скончыў Беларускі эканамічны універсітэт. Кандыдат эканамічных навук, дацэнт.

Загадваў кафедрай, з'яўляўся прарэктарам Нацыянальнага інстытута гуманітарных навук. Працаваў і стажыраваўся ў ЗША, Германіі, Кітаі.

У Нацыянальным цэнтры стратэгічных ініцыятыў "Усход—Захад" кіраваў Інстытутам незалежных даследаванняў. У 1996 годзе абраны прэзідэнтам Нацыянальнага цэнтра.

Аўтар больш як 500 публікацый, навуковых даследаванняў, дакладаў, радыё- і тэлевізійных выступаў. Сфера навуковых інтарэсаў — макраэканоміка, транзіталогія, эканамічная палітыка.

Дасканала валодае англійскай, нямецкай, французскай мовамі. Старшыня савета аналітычнага цэнтра "Стратэгія".

ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

В Киеве Валерий Новик просит политубежища

Страсбургский суд по правам человека принял к рассмотрению дело крупного белорусского предпринимателя Валерия Новика, который был арестован в Украине по требованию властей Беларуси. Валерия Новика, владельца и руководителя крупной белорусской компании "НОВиК", арестовали в Киеве 31 ноября по требованию МВД Беларуси и должны были в течение месяца передать в Минск. Однако супруга Новика Алиса при помощи украинских адвокатов собрала и передала документы в Европейский суд. Тот в свою очередь принял дело к рассмотрению и рекомендовал властям Украины приостановить процедуру экстрадиции до 8 января 2007 года.

Почему белорусские власти объявили "охоту" на Новика? Вот что по этому поводу рассказал сайту "Белорусский партизан" сам Валерий Новик:

— Власти начали преследовать меня достаточно давно. Думаю, что начало их пристального внимания к моей персоне положено еще в 1993 году. Как-то в мой офис позвонил Виктор Гончар и предложил встретиться, поговорить и познакомиться. Через неделю эта встреча состоялась. Гончар после продолжительной беседы пригласил меня в Молодечно познакомиться с Геннадием Карпенко, на то время мэром города. При встрече в здании Молодечненского горисполкома Геннадий Карпенко и Виктор Гончар поделились со мной своим видением социального развития Молодечно, рассказали о реформах, которые они намеревались там провести, и предложили зарегистрировать в Молодечно фирму, а взамен они пообещали (согласно Закону "О местном самоуправлении"), что часть налогов из тех, которые поступают в местные бюджеты, с меня не будут взиматься. Было соответствующее решение Молодечненского горисполкома, и фирма в Молодечно была создана. Год она успешно работала, а потом я был вызван повесткой в прокуратуру г.Минска, где следователь Бранчель допросил меня в качестве свидетеля по факту предоставления указанных льгот. Уже тогда я ощутил политическую подоплеку и предвзятость следствия, так как допрос строился на утверждении, что я дал Геннадию Карпенко взятку и поэтому получил льготы.

На мое замечание, что инициатор встречи был не я, а Виктор Гончар, что льготы предоставлены в соответствии с законом, мне дали почитать статью Уголовного кодекса, которая освобождает от ответственности при добровольном сознании в даче взятки. На меня оказывались также и другие виды давления: не разрешали пользоваться услугами адвоката, не давали пользоваться туалетом, несколько раз в кабинет заходил работник прокуратуры, который, мельком взглянув на документы, говорил: "О, Новик, как мы тебя еще не посадили?"

В то время я неоднократно встречался с Геннадием Карпенко и Виктором Гончаром, которые говорили мне, что это происки их политических оппонентов и скоро это закончится. Действительно, скоро это закончилось, но закончилось печально: во время очередной беседы в прокуратуре следователь Иван Бранчель сообщил мне, что я уже не свидетель, а обвиняемый по статье "Уклонение от уплаты налогов". Несмотря на очевидную абсурдность обвинения (как можно уклоняться от налогов, если тебя от них официально освободили?), прокурор на суде потребовал шесть лет лишения свободы с конфискацией имущества. Суд счел мою вину частично доказанной и приговорил к штрафу. После окончания процесса Виктор Гончар пригласил меня к себе домой и поблагодарил за выдержку, а также пожелал дальнейших успехов в будущем.

А в будущем Беларусь... ждали тяжелые времена. К власти пришел Александр Лукашенко. Уже к концу 1996 года началось жесткое противостояние с парламентом, которое закончилось избиением депутатов, не согласных с позицией Лукашенко. Потом был распущен Конституционный суд, проведен референдум, продливший полномочия Лукашенко на два года. Были выселены из своих резиденций послы 11 стран, которые в знак протеста на время покинули Беларусь. Затем началось самое худшее — исчезновение людей.

Я вынужден был уехать работать в Москву, где был владельцем фирмы по продаже автомобилей Skoda. Однако из-за семейных обстоятельств (жена с детьми категорически отказалась переезжать в Россию) был вынужден вернуться в Республику Беларусь, где в 2001 году принял приглашение гражданина России Сергея Клемантовича и стал директором ИП "Ел-Петролеум", дочернего предприятия московского ЗАО "Ел-Петролеум". Эта фирма занималась поставками в Беларусь сельскохозяйственной техники "KAAS" из Германии.

Бизнес развивался достаточно успешно, но в 2003 году в очередной приезд в Минск Клемантович был задержан по обвинению в даче взятки тогдашнему директору БМЗ Филиппову помещен в изолятор временного содержания. Однако сразу выяснилось, что взятку Клемантович давал каким-то уж совсем экзотическим способом: по официальному письму завода в безналичном порядке была произведена оплата на счет голландской фирмы за огнеупоры, которые БМЗ уже получил... То ли следствие осознало безумие таких обвинений, то ли это с самого начала была своеобразная акция устрашения, не знаю, но через 5 дней Клемантовича выпустили на свободу. Но в связи с этим делом меня также вызывали в прокуратуру на допрос.

В следующем году Клемантович появлялся в Минске крайне редко, но сделок с БМЗ не прекращал, до меня доходили слухи, что у него были проблемы с возвратом денег с БМЗ за поставленный металлолом. Но меня эти проблемы не очень волновали, так как хватало своих: сельхозпредприятия, которым была передана техника, не хотели рассчитываться, судьи отказывались принимать исковые заявления к госпредприятиям, постоянно вводились административные запреты на вывоз сахара, который удавалось получать от колхозов в счет оплаты техники... Но тут, как гром среди ясного неба, обыск в офисе фирмы и долгие допросы всех работников ИП "Ел-Петролеум". Вызывали и меня. Но допрашивали более корректно, чем в предыдущий раз. Но чуть позже я прочитал Постановление о переводе меня в статус подозреваемого, где старший следователь прокуратуры Бранчель И.И. пишет буквально следующее: "Настоящее уголовное дело возбуждено по факту злоупотребления должностными лицами РУП "БМЗ" своими служебными полномочиями, что повлекло для предприятия тяжкие последствия — ущерб в особо крупном размере" (на сумму в несколько миллионов долларов США). Это какой-то абсурд, потому что никакого отношения к БМЗ я не имел.

Версию о "непростом" характере моего дела подтверждает информация украинских правоохранительных органов, где мне конфиденциально сообщили, что за мной из Минска выехала группа из 7 человек, которые пять дней следили за моей семьей. А когда я вернулся в Киев из командировки, встретился с женой в городе и поехал за своим сыном в школу, они указали им мое местонахождение и попросили задержать меня. Более того, эти люди пытались "организовать" мою супербыструю экстрадицию в Беларусь, и двое даже приходили в Печерский РОВД и со злой ухмылкой заявляли мне, что "сегодня поедем домой".

Я не являлся действующим политиком. Я бизнесмен с четкой жизненной позицией и давно сложившимися, установившимися политическими взглядами. Взглядами, которые я никогда не скрывал и которые всегда отстаивал. Еще в 1995 году я передал в безвозмездное пользование новый автомобиль ВАЗ-2109 для передвижения деятелей оппозиции. Мною был куплен издательский комплекс "Макинтош", который использовался для подготовки печатных материалов, к различным акциям, которые проводили демократические силы страны. Неоднократно ко мне обращались различные представители оппозиционных сил с просьбой о финансовой помощи в проведении тех или иных акций, встреч, поездок, всегда (за исключением одного случая, когда проситель был мне совершенно незнаком и выглядел очень подозрительно) я оказывал помощь. Совместно с женой мы принимали участие в большинстве проводимых оппозицией шествий, митингов, концертов.

Учитывая, что во время моего пребывания в Украине, в стране моей гражданской принадлежности, возникли условия, которые не дают мне возможности возвратиться в Беларусь, я намерен получить здесь статус беженца.

"Белорусский партизан".

ОТ РЕДАКЦИИ

Этот номер газеты верстался 2 января, когда вся Беларусь еще отдыхала после новогодних празднеств. Понятно, не работали и правоохранительные органы. А потому только на следующей неделе мы сможем ознакомить читателей с их позицией по "делу Валерия Новика".

ВЫБОРЫ

Не успели оглянуться, как начинается голосование

Досрочное голосование на выборах депутатов местных Советов начнется с 9 января будущего года. Об этом БЕЛТА сообщили в Центральной избирательной комиссии Республики Беларусь. День выборов назначен на 14 января.

ЦИК уже принял постановление, разъясняющее законодательство в части порядка выдачи бюллетеней для голосования. Они будут предоставляться избирателям на основании списка граждан, имеющих право участвовать в выборах, по предъявлении паспорта. Кроме паспорта основанием для получения бюллетеня могут быть и другие документы. В частности, студенческий билет, пенсионное удостоверение, служебное удостоверение госслужащего, военный билет, справка органов внутренних дел для граждан, утративших паспорт либо сдавших его на обмен. В документах обязательно должны быть фотографии.

Параллельно с досрочным голосованием будет продолжаться агитационная кампания кандидатов в депутаты местных Советов 25-го созыва, которая началась 15 декабря. Она завершится 13 января.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

КАДРЫ

Новы пракурор знаёміцца з Брэстам

Напрыканцы года на пасяджэнні калегіі Пракуратуры Рэспублікі Беларусь Генеральны пракурор Пётр Міклашэвіч прадставіў Сяргея Хмарука ў якасці новага пракурора Брэсцкай вобласці.

Як паведамляе рэспубліканская пракуратура, С.Хмарук пачаў службу ў органах пракуратуры Віцебскай вобласці ў 1994 годзе ў якасці памочніка пракурора Чыгуначнага раёна Віцебска. Потым займаў пасады пракурора аддзела абласной пракуратуры, намесніка пракурора Кастрычніцкага раёна Віцебска, а таксама намесніка пракурора Віцебскага раёна. На працягу васьмі гадоў узначальваў пракуратуру Оршы. Да прызначэння на пасаду пракурора Брэсцкай вобласці С.Хмарук быў начальнікам аддзела рэспубліканскай пракуратуры.

Загадам генеральнага пракурора С.Хмаруку прысвоены класны чын старшага саветніка юстыцыі.

Ул.інф.

ДИПКУРЬЕР

Что купит в Минске Армения — здание или дверь для него?

Правительство Армении приняло решение об увеличении статьи доходов и расходов, предусмотренных Законом "О госбюджете на 2006 г." на 6,036 миллиона драмов (16,3 тысячи долларов). Об этом ИА REGNUM сообщили в пресс-службе правительства Армении.

Согласно сообщению, принятие решения обусловлено необходимостью выделения средств для приобретения здания в Минске для посольства Армении в Беларуси. Однако за такие деньги в Минске невозможно не то что здание купить, но даже комнату в коммуналке.

Странная получается ситуация.

Игорь МОРОЗОВ.

КРЫМІНАЛ

Наш «ілюзіяніст» апладысментаў не пачуе

Калі б славуты замежны ілюзіяніст Дэвід Коперфілд наведаў Лепельшчыну, то даведаўся, што там у яго з'явіўся паслядоўнік. Толькі, у адрозненне ад англічаніна, які дэманструе знікненне вагонаў і нават шматпавярховых дамоў, ягоны беларускі калега ўчыніў знікненне вайсковага аб'екта...

Мову адняло ў камандзіра палка сувязі, які дыслакуецца ў Лепельскім раёне, калі ён, прыехаўшы на свой камандны пункт, на звыклым месцы яго не знайшоў.

Чалавека, які "дапамог" КП знікнуць, міліцыянеры знайшлі хутка. 35-гадовы мясцовы прадпрымальнік прызнаўся следчаму, што вельмі смуткаваў, гледзячы, як пакрысе разбураецца ад снегу і дажджу закансерваваны яшчэ гадоў 10 таму будынак. А яму, маладому бізнесмену, якраз востра патрабаваліся будматэрыялы. Вось ён з дапамогай сяброў і забраў сабе тое, што, на ягоную думку, нікому ўжо не належала. А вывез ён, разабраўшы КП, 33 фундаментныя блокі і 6 жалезабетонных пліт.

Вайскоўцы ж лічаць, што малады чалавек — самы сапраўдны злодзей, які нанёс палку сувязі страты ў суме 400 тысяч рублёў. Следчыя салідарныя з вайскоўцамі. Так што прадпрымальніка-ілюзіяніста чакае суд за крымінальнае злачынства, а не ганарар за фокус.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

УЗНАГАРОДА

Прэміяй імя Алеся Адамовіча ўзнагароджаны Павел Севярынец

Савет беларускага ПЭН-цэнтра ўзнагародзіць Паўла Севярынца літаратурнай прэміяй імя Алеся Адамовіча. Пра гэта БелаПАН паведаміў член савета гісторык Уладзімір Арлоў.

Паводле яго слоў, П.Севярынец удастоены гэтай прэміі за цыкл "Лісты з лесу", якія ўжо паўтара года публікуе газета "Наша Ніва". *"Я лічу, гэта самы выдатны прыклад беларускай публіцыстыкі за апошнія гады"*, — зазначыў У.Арлоў.

Паводле слоў У.Арлова, узнагароджанне адбудзецца ў хуткім часе ў вёсцы Малое Сітна (Полацкі раён Віцебскай вобласці), дзе П.Севярынец адбывае пакаранне. *"Мы паедзем туды маленькай дэлегацыяй ПЭН-цэнтра, журналісты, пісьменнікі, уручым яму прэмію, медаль і дыплом. Мы там ужо былі, калі ўручалі пасведчанне члена ПЭН-цэнтра"*, — паведаміў У.Арлоў.

Нагадаем, у маі мінулага года суд Цэнтральнага раёна Мінска абвінаваціў Паўла Севярынца ў арганізацыі 18—19 кастрычніка 2004 года ў сталіцы масавых несанкцыянаваных выступленняў супраць афіцыйных вынікаў парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. Палітыка прыгаварылі да трох гадоў абмежавання волі, але пазней у сувязі з амністыяй гэты тэрмін быў скарочаны на год. Са жніўня 2005 года Севярынец адбывае пакаранне, працуючы ў лясгасе ў вёсцы Малое Сітна.

А 30 снежня Павел адзначыў дзень нараджэння. Яму споўнілася 30 гадоў. Віншуем! І з узнагародай, і з юбілеем.

Сяргей ПУЛЬША.

ПАЗІЦЫЯ

Леанід ЛЫЧ,
доктар гістарычных навук, прафесар

Мы што, хочам стаць расійскай правінцыяй?



У нашым грамадстве даўно і даволі трывала ўсталяваўся погляд на Беларусь як на краіну шматнацыянальную. "Заслуга" ў тым перш за ўсё афіцыйных сродкаў масавай інфармацыі. Добра стараюцца ў пашырэнні такога погляду педагагічныя калектывы ўсіх тыпаў навучальных устаноў. І падаецца гэта па-асабліваму ўзнёсла, з вялікім гонарам за сваю краіну. Я ж, наадварот, ніяк не магу адштурхнуцца ад "крамольнай" думкі, што Беларусь мо ўвогуле не з'яўляецца нацыянальнай краінай... Фармальна (але толькі фармальна!) тут ёсць адна нацыя — беларуская. Чаму — адна? Ды таму, што і раней і зараз у Беларусі толькі беларусы (сёння да немагчымасці зрусіфікаваныя) жывуць на сваёй гістарычнай радзіме, этнічнай зямлі. Усю ж астатнюю частку насельніцтва складаюць *не розныя нацыі* і народнасці, а толькі іх *прадстаўнікі.*

У гэтых прадстаўнікоў дзесьці на планеце Зямля ёсць гістарычная радзіма — розных форм уласныя дзяржаўныя ўтварэнні, што не дае падстаў, каб тую ці іншую *этнічную супольнасць* у Беларусі называць народам, нацыяй. Патлумачу. Звычайна да ўлады прыходзяць і кіруюць краінай асобы з высокай нацыянальнай свядомасцю, адданыя культурнамоўным традыцыям уласнага народа, шчыра зацікаўленыя ў захаванні яго этнічнай адметнасці. Дзякуючы такім асобам дзяржава здольна выратаваць свой народ ад этнічнай смерці ў выніку дэнацыяналізацыі. Гэта і дае адказ на пытанне, чаму народы імкнуцца да стварэння на сваёй гістарычнай радзіме ўласных дзяржаў. Мала каму лёгка ўдавалася аформіцца ў дзяржаўную нацыю, але калі такое здзяйснялася, яна аказвалася ў вялікім выйгрышы, бо і сапраўды **нічога не бывае больш лёсавызначальнага за рэальна суверэнную нацыянальную дзяржаву.**

Беларусам пакуль што далёка да такога запаветнага ідэалу, паколькі ўладныя структуры ў найважнейшай сферы жыццядзейнасці свайго народа — культуры — мэтанакіравана праводзяць русіфікатарскую палітыку. У выніку ў беларусаў сёння няма пасапраўднаму ні нацыянальнай адукацыі, ні элітарных пластоў культуры, ні сродкаў масавай інфармацыі, ні тапаніміі, ні візуальнага афармлення населеных пунктаў і памяшканняў, ні маркіроўкі прамысловых тавараў і харчовых прадуктаў. Дзяржаўнасць беларусаў, калі называць рэчы сваімі імёнамі, сёння мае чыста сімвалічны характар (што зусім не азначае немагчымасць пераўтварэння яе пры адпаведных умовах у рэальнасць). Што ж датычыць існуючых у Рэспубліцы Беларусь нацыянальных меншыняў, дык ніводная з іх не надзелена нават самай элементарнай абласной аўтаноміяй. І гэта справядліва, паколькі яны не маюць тут гістарычнай радзімы, жывуць не на сваёй этнічнай тэрыторыі. Не маю сказаць пра іх з гэтай нагоды — Божа збаў! — нічога благога, хай жывуць на здароўе разам з беларусамі, маючы з усімі роўныя правы і нашу шчырую прыязнасць. Але, каб называцца этнасам, народам, нацыяй, трэба яшчэ валодаць і пэўнымі колькаснымі параметрамі.

Вядома, што на Беларусі сустракаюцца нацыянальныя групы колькасцю сто і нават менш чалавек. Дык што, называць і іх этнасам, народам, нацыяй Беларусі? Да таго яшчэ многія з іх жывуць некампактна, не падтрымліваюць паміж сабой сталых кантактаў. Прадстаўнікоў такіх нацый нельга аднесці нават да этнічных супольнасцяў, бо для гэтага патрэбна пэўная сумесная дзейнасць людзей, накіраваная на падтрыманне адпаведных для іх краін-метраполій нацыянальна-культурных традыцый.

Калі ж не браць пад увагу вышэйсказанае, дык у свеце, напэўна, можна было б налічыць... дзесяткі беларускіх нацый (акрамя самой Беларусі): беларусы жывуць ва Украіне, у Расіі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі... На самой жа справе *на зямной кулі толькі адна беларуская нацыя*, і месца знаходжання яе — галоўным чынам Рэспубліка Беларусь. Пішу "галоўным чынам", бо па чужой волі адарваная ад метраполіі частка беларусаў жыве зараз у Польшчы, Літве, на Смаленшчыне, Браншчыне, Чарнігаўшчыне — на этнічных сваіх землях, дзе калісьці жылі іх продкі (гэтыя тэрыторыі ўваходзілі ў склад беларускай сярэднявечнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага). Гэтую частку беларусаў ні ў якім разе нельга называць ні этнічнымі групамі, ні нацыянальнымі меншынямі, ні беларускай дыяспарай, бо яны адарваныя толькі ад сённяшняй Беларусі, а не ад роднай, этнічнай зямлі. Называць, да прыкладу, беларусаў Беласточчыны нацыянальнай меншынёй — значыць глядзець на іх не як на гаспадароў у роднай хаце, а на Бог ведае якім ветрам занесеных сюды людзей. Яны ж жывуць там, дзе жылі спрадвеку.

Галоўны крытэрый залічэння той ці іншай супольнасці да нацыянальнай меншыні — гэта пражыванне за межамі сваёй гістарычнай радзімы. Менавіта кіруючыся такім прынцыпам, аўтарскі калектыў кнігі *"Очерки истории белорусов в Сибири в XIX—XX вв."* ("Новосибирск. 2001), да якога належыць і аўтар дадзенага артыкула, нават і думкі не дапускаў, каб гэтай кнізе можна было даць прыкладна такі загаловак: "Очерки истории белорусского этноса в Сибири в XIX—XX вв.". Бо нашы землякі там не на сваёй тэрыторыі. А вось каб нешта падобнае давялося пісаць, скажам, пра буратаў, якутаў, тувінцаў, хакасаў, алтайцаў, ненцаў, эвенкаў, хантаў, мансі, даўганаў Сібіры, то ў дачыненні да любога з іх можна і трэба ужываць тэрміны *"народ", "этнас", "нацыя", бо жывуць яны, як і іх продкі, на сваёй гістарычнай радзіме.* У нас жа нават на старонках навуковых публікацый можна сутыкнуцца з выкарыстаннем тэрмінаў "народ", "этнас", "нацыя" ў дачыненні да *прадстаўнікоў нацый*, што жывуць на Беларусі. Найбольш грашаць парушэннем прынцыпу гістарызму афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі, палітыкі, дзяржаўныя ідэолагі, асабліва падчас мерапрыемстваў міжнацыянальнага характару. Ад каго тады толькі не пачуеш: "Беларусь — шматнацыянальная краіна", "На Беларусі жыве больш за сто народаў"... Апускаецца ўсяго толькі адно слова — "прадстаўнікі", і атрымоўваецца самы сапраўдны алагізм, бязглуздзасць.

Было б памылковым тлумачыць блытаніну ў гэтым пытанні толькі нізкім узроўнем дасведчанасці пра сутнасць складаных этнічных працэсаў. Прызнанне чыноўніцкім апаратам Беларусі за "шматнацыянальную" краіну мае зусім відавочную палітычную падаплёку: у ім так ці інакш гучыць апраўданне, чаму наша дзяржава не забяспечвае прыярытэт культуры і мовы тытульнай нацыі краіны, праводзіць палітыку іх разбурэння. У гэтым я пераканаўся і падчас размовы з адной даволі высокага рангу дзяржаўнай асобай. На маё сцвярджэнне, што ў заняпадзе нацыянальнай сістэмы адукацыі і культуры найбольш за ўсё вінаваты ўлады, а не народ, пачуў прыкладна такое: "Што вы ўсё пра беларускае ды беларускае! У нас жа, акрамя беларусаў, жывуць яшчэ больш за сотню нацый. Іх духоўныя запатрабаванні паўней за ўсё могуць задавальняцца шырокім распаўсюджваннем у краіне рускамоўнай адукацыі і культуры, ад якіх не адварочваюцца і самі беларусы". Далейшых маіх меркаванняў субяседнік не пажадаў і слухаць: чыноўнік безнадзейна хворы на нацыянальны нігілізм. Колькі іх такіх — процьма!

А мне хацелася давесці, што **Беларусь — аднанацыянальная краіна. У ёй толькі адзін тытульны народ, і гэтая краіна толькі для беларусаў з'яўляецца метраполіяй, этнічнай, гістарычнай радзімай, Бацькаўшчынай.** Адсюль зусім заканамерным і юрыдычна абгрунтаваным падаецца патрабаванне беларусаў са здаровай нацыянальнай самасвядомасцю *забяспечыць не на словах, а на справе ўсе ўмовы для самабытнага этнакультурнага развіцця.* Але гэта немагчыма, пакуль руская мова пануе ва ўсіх сферах дзяржаўнай, эканамічнай, адміністрацыйнай дзейнасці, у народнай адукацыі, афіцыйных сродках масавай адукацыі, элітарных пластах культуры. **Ніводная тытульная нацыя краін планеты Зямля так не абкрадаецца самой дзяржавай, як беларуская.** І гэтага ніяк нельга апраўдаць "клопатамі" ўладных структур пра "больш чым сто нацыянальнасцяў" Беларусі...

У іншых жа краінах свету, тытульныя народы якіх развіваюцца паводле уласных культурна-моўных стандартаў, жывуць нармальна і паўнакроўна ва ўсіх сэнсах і прадстаўнікі нацыянальных меншыняў. Чаму ж такое не можа быць прыкладам для Беларусі? Упэўнены, ніхто не назваў бы нашу краіну шавіністычнай, калі б у ёй нацыянальная культура, адукацыя, мова тытульнага народа займалі ў грамадскім жыцці прыярытэтнае месца, як гэта сёння назіраецца, скажам, у Расійскай Федэрацыі (дарэчы, класічна поліэтнічнай), ды і на ўсёй постсавецкай прасторы. Колькі ж часу Беларусі можна заставацца "белаю варонаю" сярод паважаючых сябе краін?

Сказанае зусім не азначае, што я, паўтаруся, выступаю з нейкіх "нехароших" позицый адносна *прадстаўнікоў розных народаў*, якія з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі. Ні ў якім разе я не супраць забеспячэння ім усіх правоў і самых спрыяльных умоў для культурнага развіцця ў адпаведнасці з іх нацыянальнымі традыцыямі. Я вельмі цаню культурнамоўную разнастайнасць планеты Зямля і жадаю, каб такое было і на Беларусі: гэта ўзбагачае ўсіх! Для мяне асабіста сапраўднае свята душы — Дні нацыянальных культур у Беларусі, якія ўжо сталі добрай традыцыяй. Хацеў бы, каб такая практыка працягвалася, у гэтай добрай справе не магу не падтрымаць афіцыйныя ўлады. Але **калі ў культурнай разнастайнасці насельнікаў краіны да нуля звядзецца беларускі фактар, то трэба "каравул" крычаць!** А справа акурат ідзе да гэтага з-за свядомага вывядзення дзяржавай беларускай мовы з грамадскага жыцця.

Спадзявацца, што ў такіх варунках можа развівацца беларуская нацыянальная культура, няма аніякіх падстаў. Сусветная практыка дае масу прыкладаў, што **са стратай нацыянальнай мовы гіне і нацыянальная культура.** Мова — самы дасканалы і ўсеабдымны крытэрый вызначэння этнічнай прыналежнасці культуры. Складзены беларусам на рускай мове тэкст песні ці напісаная да яе беларусам музыка — гэта ўжо не элемент беларускай нацыянальнай культуры. Тое ж самае можна сказаць пра оперу, аперэту, драматычны твор, няхай нават напісаныя на сюжэт з беларускага жыцця... Адабранне дзяржавай у роднай мовы сацыяльных функцый непазбежна прывяло да зніжэння яе ролі ў сферы культуры і рана ці позна скончыцца поўнай стратай нацыянальнага характару.

Цэнячы клопаты дзяржавы аб культурным развіцці этнічных груп у краіне, хацеў бы, каб яна, нарэшце, адважылася на рашучыя практычныя захады да прадухілення дэфармацыі нацыянальных асноў беларускай культуры. І самым важным з такіх захадаў, несумненна, павінна быць **забеспячэнне прыярытэту роднай мовы беларусаў**. Тады ні ў кога, прычым і ў многіх беларусаў, не ўзнікала б сумнення **датычна існавання самабытнай, адрознай ад рускай, беларускай нацыі**. Аднак не верыцца, што сучасная наша дзяржава, так моцна залежная ад Масквы, знойдзе ў сабе сілы пайсці такім разумным, лёсавызначальным курсам.

Планамерная дзейнасць адарванага ад духу бацькоўскай зямлі чыноўніцкага апарату па адлучэнні карэннага насельніцтва ад уласных прыродных культурна-моўных пачаткаў пакідае ўсё менш і менш падстаў, каб глядзець на нас як на самабытную, адметную ад іншых нацыю. Каб ёю быць, **трэба жыць паводле сваіх, а не чужых духоўных стандартаў**. Беларуская нацыя, калі паважае сябе, павінна мець беларускамоўны дзяржаўны, адміністрацыйна-гаспадарчы, судовы, вайсковы апараты, беларускамоўныя адукацыю, культуру, навуку, афіцыйныя СМІ, тапанімію, напоўненую сваімі назвамі. Адным словам, рабіць усё так, як і ў іншых цывілізаваных народаў. А паколькі ўсяго гэтага ў нас няма, дык ужо і сёння куды больш лагічным называць тытульны народ краіны не беларускай нацыяй, а нейкім бесструктурным, безназоўным соцыумам, які, праўда, яшчэ да канца не адарваўся ад родных каранёў і поўнасцю пакуль не інтэграваны ў рускі этнас. Але на парозе таго.

Не па віне народа, а ў выніку свядомай дзяржаўнай палітыкі сталася так, што зараз *архіпраблематычным з'яўляецца захаванне на беларускай зямлі беларусаў.* Справа дайшла да таго, што ў асноўнай масе карэннае насельніцтва краіны ўжо адлучана ад роднай мовы і ў значнай ступені — ад нацыянальнай культуры, за выняткам яе фальклорных пластоў. Спрэс не толькі ў афіцыйным, але і ў прыватным жыцці пануюць руская культура і мова, якім адпавядае і дзейнасць галоўнай у краіне хрысціянскай канфесіі — праваслаўнай.

Ці ж можна ў такой сітуацыі беларусаў называць паўнавартаснай, класічнай нацыяй? Вядома, не, бо не адбываецца іх самасцвярджэння праз выкарыстанне ўласнага нацыянальна-духоўнага матэрыялу. Вялікімі намаганнямі чужых і ўласнага палітычных рэжымаў яны ледзь не канчаткова выпхнуты з беларускага арганізму рускім матэрыялам.

Далейшай трансфармацыі беларусаў у безнацыянальную, безаблічную масу неабходна як мага хутчэй пакласці канец. Дзякуй Богу, яшчэ не ўсё канчаткова страчана. Але хутка нас могуць залічыць (што ўжо і робяць у сваіх заявах кіраўнікі абедзвюх нашых краін) да рускіх. Такое немінуча адбудзецца, калі і надалей пры маўклівай згодзе беларусаў дзяржавай будзе праводзіцца мэтанакіраваная палітыка русіфікацыі. Здаровыя колы беларускага грамадства павінны згуртавацца і **рашуча выступіць супраць пераўтварэння насельніцтва краіны ў нешта "прамежкавае",** што не абміне і ўсе яе этнічныя групы, хіба што за выключэннем рускай. І беларуская зямля пераўтворыцца ў тыповую рускую культурна-моўную правінцыю, насельніцтва якой будзе называць сябе рускім, да чаго так імкнуўся ўсё ў другой палове XIX ст. стаўленік царскіх улад на пасадзе віленскага генерал-губернатара Міхаіл Мураўёў.

Дык ратуймася ж усёй грамадой ад такой злыбяды!

ЧУЛІ?

Нацбанк Беларусі ўводзіць у абарачэнне памятныя манеты квадратнай формы

У самыя апошнія дні мінулага года Нацбанк краіны ўвёў у абарачэнне памятныя манеты квадратный формы "Дуга Струвэ": сярэбраную — наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 33,62 г; і медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, масай 15,5 г, таксама квадратнай формы.

Як паведамляе Нацбанк, на вонкавым баку манет размешчаны: уверсе злева — рэльефная выява Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, справа — надпіс: "РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ"; у цэнтры — контурная выява Рэспублікі Беларусь і схема пунктаў Дугі Струвэ на яе тэрыторыі, унізе ўказаны проба сплаву і намінал — "20 РУБЛЁЎ" на сярэбранай і "1 РУБЕЛЬ" — на медна-нікелевай, а таксама на кожнай манеце — год чаканкі.

На адваротным баку манет размешчаны: злева — рэльефная выява карты Еўропы, па якой праходзіць Дуга Струвэ, справа — выява карты свету, пад ім надпісы: "ДУГА СТРУВЭ" і яе працягласць — 2880 км, па перыметры манеты дадзены назвы краін, праз якія праходзіць Дуга Струвэ: "НАРВЕГІЯ ШВЕЦЫЯ ФІНЛЯНДЫЯ РАСІЯ ЭСТОНІЯ ЛАТВІЯ ЛІТВА БЕЛАРУСЬ УКРАІНА МАЛДОВА".

Да ведама. Дуга Струвэ — сетка з 265 пунктаў, што ўяўляюць сабой закладзеныя ў зямлю каменныя кубы памерам два на два метры, працягласцю больш за 2820 км. Стваралася ў мэтах вызначэння параметраў Зямлі, яе формы і памеру. Цяпер пункты дугі можна знайсці на тэрыторыі Нарвегіі, Швецыі, Фінляндыі, Расіі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Беларусі, Малдовы і Украіны. Гэтыя краіны 28 студзеня 2004 года звярнуліся ў Камітэт ЮНЕСКА па сусветнай спадчыне з прапановай аб зацвярджэнні 34 пунктаў Дугі Струвэ, што захаваліся, у якасці помніка сусветнай спадчыны.

Аляксей АРЭШКА.

СКАНДАЛ

Госконтроль выявил очередных директоров-нарушителей

И предложил привлечь к дисциплинарной ответственности руководителей президентской структуры Национальный парк "Нарочанский", а также должностных лиц Мядельского района.

Проверка Нарочанского края проводилась в соответствии с указом Лукашенко "О Государственной программе экологического оздоровления озера Нарочь на 2005—2008 годы". Проверяющие из Госконтроля интересовались, как реализовывается Госпрограмма, куда и как тратятся бюджетные деньги, законно ли в водоохранной зоне озера Нарочь были возведены коттеджи и хозяйственные постройки.

Полтора года назад по личному поручению Лукашенко была начата проверка еще одного структурного подразделения Управделами президента Национального парка "Браславские озера". Итогом той проверки стало три персональных уголовных дела и строгий приговор суда. Директор "Браславских озер" был осужден на 10 лет лишения свободы, начальник отдела охраны животного мира, водоемов и охотничьего хозяйства на 7 лет, главный бухгалтер — на 4 года.

Руководство Национального парка "Нарочанский", надо полагать, отделалось легким испугом. Итогом проверки Госконтроля стали лишь рекомендации привлечь к дисциплинарной ответственности директора парка "Нарочанский" Василия Коржова и его заместителя Валерия Люштыка. Кроме того, проверяющие обратились к Прокуратуре страны и Министерству внутренних дел с предложением рассмотреть вопрос о привлечении к дисциплинарной ответственности прокурора Мядельского района В.Чаевского и начальника РОВД Мядельского района В.Маликова.

Не обошли своим вниманием представители Госконтроля и начальников рангом повыше: Управделами президента рекомендовано дисциплинарно наказать начальника Главного управления капитального строительства Управделами Вячеслава Панасюка, а Миноблисполкому — заместителя председателя облисполкома Анатолия Мирчука и председателя Мядельского райисполкома Александра Даниленко. Но, видимо, хуже всех после той масштабной проверки чувствуют себя начальник Мядельской районной инспекции природных ресурсов и охраны окружающей среды Иван Тарасенок и начальник Мядельской районной землеустроительной и геодезической службы Леонид Яворский. Их рекомендовано отстранить от занимаемых должностей.

Что же такого крамольного обнаружили проверяющие Госконтроля в Нарочанском крае? Пресс-служба главного контрольного органа страны сообщила, что в Национальном парке "Нарочанский" была проверена реализация 31 мероприятия Госпрограммы и выявлено очень много нарушений. И коттеджи в водоохранной зоне озера Нарочь возводились самовольно, и рыбу в Нарочи ловили незаконно. А нецелевое использование бюджетных средств исчисляется сотнями миллионов белорусских рублей!

Генеральный директор Национального парка "Нарочанский" Василий Коржов, ссылаясь на занятость (через своего секретаря) никаких комментариев "Народной воле" по поводу проверки давать не стал. В его приемной пояснили, что пока никаких официальных предписаний о дисциплинарных взысканиях руководство парка не получало. И вообще, в ходе проверки сами проверяющие допустили ряд ошибок. Поэтому еще рано говорить о конечных выводах и результатах...

Как оно будет на самом деле, время покажет.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

КОРОТКО

Две культурные столицы

В 2007 году титул культурной столицы Европы будут носить сразу два города — Люксембург и Херманштадт.

Впервые звание культурной столицы было присвоено в 1985 году Афинам. Дело в том, что с идеей учреждения этого титула выступила министр культуры Греции Мелина Меркури. После расширения ЕС на восток было принято решение ежегодно выбирать сразу две культурные столицы: одну в Восточной, другую в Западной Европе. Новое правило должно было вступить в силу в 2009 году, однако Люксембург и румынский Херманштадт сумели убедить экспертную комиссию сделать исключение. Оба города связывает общее культурное прошлое и настоящее.

Культурная столица Европы — это не просто престижный титул для привлечения в город туристов. Победителям конкурса Евросоюз выделяет серьезные средства на поддержку и восстановление культурного наследия города.

Подушки безопасности для пешеходов

Теперь, когда подушками безопасности внутри автомобилей никого не удивишь, ЕС задумал аналогичные устройства устанавливать снаружи — для пешеходов.

Цель инженера Йенса Бовенкерка состоит в том, чтобы повысить безопасность пешеходов. Согласно его исследованию, наиболее эффективной защитой, особенно в тяжелых случаях, является подушка безопасности. *"Ее можно расположить снаружи автомобиля, между капотом и ветровым стеклом"*, — поясняет инженер. В действие ее должен привести специальный сенсор, вмонтированный в передний бампер. Подобно обычной подушке внутри машины, внешнее устройство будет надуто специальным газом за долю секунды.

Задача состоит в том, чтобы этого короткого времени хватило для предотвращения контакта головы пешехода с лобовым стеклом. Разумеется, подушка не защитит от удара об асфальт, но именно эти травмы дают почему-то меньше фатальных последствий. Поэтому Бовенкерк убежден: *"При помощи подушек безопасности для пешеходов мы заметно уменьшим число смертей на дорогах"*.

РАЗМЫШЛЯЯ О БУДУЩЕМ

Кому нужен евро-азиатский блок, и возможен ли он?

Наблюдение за развитием стратегического мышления в России позволяет увидеть ставшее отчетливым желание противостоять мировому господству Соединенных Штатов. Идея, обсуждаемая в некоторых геополитических кругах, состоит в том, чтобы создать евро-азиатский блок, способный стать противовесом претензиям на доминирование на мировой арене. Насколько реалистичен подобный сценарий?

Инструментом, который Москва могла бы использовать для создания общего евро-азиатского пространства, могла бы стать Шанхайская организация сотрудничества (ШОС), куда, помимо России, входят Китай, Казахстан, Киргизия, Узбекистан и Таджикистан. В эту организацию можно было бы пригласить Индию и Иран — ядерную и почти ядерную державы. Если Иран такое предложение, вероятно, заинтересует, относительно Индии в настоящее время этого утверждать нельзя, поскольку в связи с визитом Джорджа Буша в Дели индийская и американская позиции сблизились.

Китай и Индия являются крупными импортерами нефти и газа внутри ШОС, в то время как другие члены организации экспортируют энергоносители, а Россия и Иран вообще являются крупнейшими в мире производителями газа. Инвестиции в исследования и развитие технологий в сочетании с возможным альянсом с Индией и Китаем в этой сфере могли бы сделать из региона в целом прекрасную стартовую площадку для экономического развития, позволяющую странам-участницам соединить природные ресурсы, рабочую силу и высокие технологии — едва ли не самое грозное сочетание из всех возможных.

Однако в геополитическом отношении все не так просто. У Китая есть слабые места. Там могут усиливаться общественно-политические движения по мере того, как будет углубляться пропасть между "нуворишами" и сельским населением, живущим в нищете без надежды на лучшее.

Положение Китая по отношению к России тоже неоднозначно. Россия является главным партнером Пекина, когда речь идет о приобретении энергоресурсов или военной техники, но за иностранные инвестиции эти две страны отныне конкурируют. При этом Москву, пусть она и не говорит об этом открыто, беспокоит демографический рост в Китае, который может в рамках Шанхайского соглашения трансформироваться в мирный захват китайцами Сибири, столь богатой природными ресурсами.

Что касается государств Центральной Азии, то они нуждаются в защите со стороны России и Китая от исламистских движений, которые угрожают нынешним властям. Более того, они нуждаются в России, Иране и Турции для перекачки своей нефти.

Важное действующее лицо в создании евро-азиатского экономического блока — Турция, занимающая ключевое положение между основными зонами добычи энергоресурсов (через эту страну проходит несколько нефтепроводов). Желание Соединенных Штатов заставить ЕС принять в свой состав Турцию отражает надежду на то, что она могла бы увлечь на свою орбиту центральноазиатские республики и тем самым вывести их из-под российского влияния.

Президент Пакистана, со своей стороны, повернувшись лицом к Вашингтону, тем самым подставил спину исламистам. В довершение ко всему Москва может разжечь тлеющий конфликт в Кашмире, чтобы оказать давление на Индию.

В силу наличия множества противоречащих друг другу и разнонаправленных интересов создание евро-азиатского экономического союза не является делом очень сложным.

Мишель АКЕРИБ,
профессор Люксембургского университета,
член научного совета Франко-швейцарской федерации по вопросам энергетики (FRE).
Le Temps.

БЫВАЕТ

Спутница в качестве «чаевых»

Главная тема разговоров лондонских таксистов — не то, кого они подвозили, а что забыли в салоне их пассажиры. Они рассказывают о любопытной коллекции утерянных вещей, которые они находят на задних сиденьях.Один мужчина забыл в такси свою подвыпившую и уснувшую девушку, заявив водителю, что оставляет ее в качестве чаевых. На другого водителя свалился мужчина в одних трусах. Водители сообщили о том, что находили в своих кэбах пулемет, старинный телескоп и мешочек с бриллиантами на сумму 100 тысяч долларов.

По итогам опроса 2 тысяч водителей такси в 11 городах мира, Лондон оказался самым забывчивым местом, где в такси оставляют самые причудливые вещи. Лишь за последние 6 месяцев в лондонских такси было потеряно 54.872 мобильных телефона, 3179 ноутбуков и 923 карты памяти.

Однако есть и хорошая новость для пассажиров такси: честные водители быстро вернули хозяевам огромное количество вещей. Лондонские таксисты, как оказалось, принадлежат к особенно честной породе: хозяева получили назад 96% мобильных телефонов и 97% потерянных ноутбуков.

ФОТОВЗГЛЯД

Важнейшие события 2006 года

В июле Израиль начал операцию в Ливане против военизированной шиитской группировки "Хезболла", добиваясь возвращения захваченных боевиками израильских военных.

Вскоре разразился конфликт, сопровождавшийся бомбежками Бейрута авиацией Израиля и ракетными обстрелами израильских городов со стороны "Хезболлы". В результате конфликта погибли сотни гражданских лиц с обеих сторон.

В октябре 2006 года Северная Корея объявила об успешном испытании ядерного оружия.

Мир очень бурно отреагировал на эту новость. Даже Китай, считающийся ближайшим союзником КНДР, назвал поведение северокорейских властей "дерзким". А Совет Безопасности ООН ввел жесткие санкции в отношении этой страны.

В сентябре в Таиланде произошел военный переворот. Обошлось без крови.

Генералы свергли правительство премьер-министра Таксина Чинавати, которого обвинили в злоупотреблении своими полномочиями. Чинавата не смог вернуться в страну, а его обязанности исполняет отставной генерал. Военные обещали провести в 2007 году выборы.

Промежуточные выборы в Конгресс США прошли под знаком потерь для республиканцев и приобретений для демократов. Впервые за многие годы демократам удалось получить большинство в обеих палатах Конгресса. Теперь президенту Джорджу Бушу придется откорректировать многие элементы своей политики. Также впервые — на этот раз в истории США — спикером Конгресса стала женщина, представительница демократов Нэнси Пелоси.



Кульминация суда над бывшим иракским лидером Саддамом Хусейном попала на начало ноября. Он был признан виновным в совершении преступлений против человечности, а именно — в причастности к массовой резне 148 мусульман-шиитов в деревне Дуджаил в 1982 году. Он приговорен к смертной казни через повешение. Когда оглашали приговор, он выкрикивал угрозы, пока его не вывели из зала.

В канун Нового года приговор был приведен в исполнение.

ЧТО НОВЫЙ ГОД ДЛЯ НАС ГОТОВИТ?

Опасный вакуум мировой власти

В 2007 году произойдет смена караула в мировой политике. Политическая карьера Кофи Аннана, Тони Блэра и Жака Ширака подходит к концу. Генеральный секретарь ООН уходит с поста 31 декабря, новый президент Франции будет избран в мае, а премьер-министр Великобритании, как ожидается, наконец покинет официальную резиденцию по адресу Даунинг-стрит, 10 к началу лета.

На этом текучка кадров лидеров мировой политики не остановится. Президенты Владимир Путин и Джордж Буш должны покинуть посты в 2008 году. Это означает, что главы четырех из пяти постоянных членов Совета Безопасности ООН и сам генеральный секретарь сменятся меньше чем за два года.

В Великобритании, Франции и ООН новые лидеры сулят новые возможности. Пан Ги Мун, новый генеральный секретарь ООН, получит возможность попытаться улучшить отношения ООН с Америкой. Гордон Браун, который почти наверняка сменит Блэра в кресле премьер-министра, может представить новый взгляд на катастрофическую иракскую политику. Новый президент Франции может показать миру менее чванливое лицо.

Однако в таких масштабных переменах в высших эшелонах власти по всему миру кроется и некоторый риск. Высока вероятность, что в 2007 году развернутся новые кризисы на Ближнем Востоке, а многие опытные политики уходят со сцены одновременно. Ширак играл важную и конструктивную роль в Ливане. Блэр и Аннан знают иранское досье и историю палестино-израильского конфликта вдоль и поперек.

Их потенциальные преемники гораздо менее осведомлены. У Пан Ги Муна нет по существу никакого опыта в международной дипломатии за пределами Азии. Гордон Браун занимался только внутренней политикой. То же можно сказать и о двух основных претендентах на должность президента Франции — Николя Саркози и Сеголен Руайяль.

Так где же мир должен искать новых руководителей в 2007 году?

Вакуум на верхушке может стать шансом для Японии и Германии сделать более решительные шаги вперед. Синдзо Абэ, новый премьер-министр Японии, отличается националистическими взглядами, но он взял многообещающий старт, попытавшись наладить отношения с Китаем. Канцлер Германии Ангела Меркель находится в еще более выгодном положении, чтобы оказать позитивное влияние на мир в 2007 году. В начале года к Германии на шесть месяцев переходит председательство в ЕС и на целый год — председательство в Большой восьмерке. И хотя Меркель сдает позиции в опросах общественного мнения внутри страны, на международной сцене она приобрела уважение.

У канцлера Германии сдержанный интеллигентный стиль поведения, который внушает доверие.

Однако на самом деле никто не ожидает, что лидеры Германии и Японии обретут достаточный вес, чтобы компенсировать уход со сцены такого большого количества их коллег. Даже если они вознесутся до звездного олимпа, этот вакуум мировой власти пугает.

Financial Times.

ВЗГЛЯД ИЗ-ЗА ОКЕАНА

Хватит злорадствовать, старая Европа!

В день, когда был опубликован доклад Джеймса Бейкера, я стиснула зубы и стала ждать, когда франко-германская "старая Европа" начнет злорадствовать. Ждать пришлось недолго.

"Америка перед лицом иракской катастрофы", — гласил заголовок в Der Spiegel. Покровительственным тоном опытного врача Le Monde поставила диагноз "политическая лихорадка" состоянию, охватившему Вашингтон из-за Бейкера. В статье Suddeutsche Zeitung говорилось, что доклад "лишил Буша власти..."

Нет никаких сомнений в том, что иракская война подорвала доверие к Америке в "старой Европе", как и повсюду. Нет никаких сомнений в том, что репутация компетентной Америки разрушена. Но это не означает, что есть десятки энергичных кандидатов или даже один энергичный кандидат, жаждущий заменить США.

"Ирак — это катастрофа, теперь нам придется приводить все в порядок", — сказал знакомый немецкий дипломат. "Германия думает о большей роли в Ираке", — сообщал еще один заголовок в Der Spiegel. Но Германия славится своим нежеланием отправлять солдат или кого-то еще туда, где есть что-то похожее на войну. В настоящее время немецкие политики не могут договориться даже о том, следует ли разрешать их солдатам воевать в Афганистане, где они расквартированы не один год. Франция тем временем объявила, что выводит из Афганистана все свои войска. Так как же конкретно будут наводить порядок в Ираке? Какой будет эта "большая роль"?

"Мы будем обучать судей и полицейских", — объяснил мой знакомый. Конечно, когда война кончится..

Еще в Европе есть несколько дипломатических оптимистов — людей, которые надеются, что Европа может стать "ближневосточной свахой", как выразился один автор, и заставит Иран и Сирию быть полезнее и добрее в Ираке — или хотя бы перестать финансировать мятежников. Предположительно, это те же самые оптимисты, которые верили, что франко-германо-британская дипломатическая бригада сможет уговорить Иран прекратить исследования, ведущие к созданию ядерного оружия. Предположительно, они не заметили, что президент Ирана Махмуд Ахмадинежад недавно провел в Тегеране конференцию отрицателей Холокоста (возможно, это не самый внятный сигнал, что он хочет подружиться с благонамеренными европейцами) и что президент Франции Жак Ширак недавно объявил, что его мнение о Сирии полностью совпадает с мнением его американского коллеги.

Странная реальность такова, что, за некоторыми исключениями, большинство европейских правительств, вне зависимости от их первоначального отношения к войне, официально или неофициально выступают против немедленного вывода американских войск. За выводом может последовать хаос и этот хаос, будет гораздо ближе к Европе, чем к Северной Америке. Многие европейские правительства, официально или неофициально, уже сейчас обеспокоены тем, что следующий американский президент может устраниться от мировой политики.

Здесь нет никого ни на каком посту, кто верил бы, что Европа — при всех ее недавних экономических достижениях, при всей ее торговой мощи и при всей ее нелюбви к американской внешней политике — заменит США в обозримом будущем. Германия занимает место председателя Европейского Союза и поэтому Германия рассуждает об интеграционной политике ЕС, иммиграционной политике ЕС и экономике ЕС. Она не рассуждает о том, как Европейский Союз возьмет на себя главную военную и дипломатическую роль на Ближнем Востоке. Германия даже не хочет, чтобы другие потенциальные мировые державы — скажем, Россия или Китай — заменили США в роли господствующей сверхдержавы.

В этой странной реальности есть очень тоненький лучик надежды: может быть, теперь немцы и даже французы наконец поймут, что нет лучшей альтернативы трансатлантическому партнерству, нет лучшей международной организации, чем НАТО, нет реальной "роли" ни для кого из нас за пределами западного альянса — хотя бы только потому, что все альтернативы хуже. Может быть, "старая Европа" найдет в себе силы больше поддерживать альянс и помогать ему, если не в военной, то в дипломатической и идеологической сфере.

Единственную возможность справиться с новыми угрозами, которые представляет распадающийся Ирак, поднимающийся Иран и шатающийся Ближний Восток, дает Западу единая политика и общая стратегия.

Анна АППЕЛЬБАУМ.
Washington Post.

ВСТРЕЧИ

...Она выросла в Ивацевичах

Павел ШЕРЕМЕТ

В декабре в иракском городке Эрбиль я познакомился с Любовью Иосифовной и ее семьей. В 1958 году она встретила и полюбила курдского партизана, который бежал с отрядом повстанцев в Советский Союз. Они поженились, у них родилось трое детей.

В 1972 году семья переехала на север Ирака, на родину мужа. Муж партизанил в составе курдской повстанческой армии в иракских горах, воевал против власти Саддама Хусейна. Любовь Иосифовна спасала детей. Как жена врага иракского народа она много лет провела в ссылке, над ней издевались, ее запугивали.

Можно представить, что перенесла эта женщина в арабской стране с мужем-партизаном. Для соседей и знакомых она всегда была и остается русской. Но в нашем разговоре она несколько раз меня исправляла. Она считает себя белоруской. Она родилась и выросла в Ивацевичах. И хотя последний раз была на родине в 1972 году и почти все ее родные уже умерли, она не забывает своих корней. Красивая, статная женщина. Волевая, сохранившая и острый ум, и внутреннюю силу, Любовью Иосифовной может гордиться любой народ. Нам повезло, что среди белорусов много таких прекрасных женщин.

РЕДКИЙ СЛУЧАЙ

Родила в 67!

67-летняя жительница Испании родила близнецов, став таким образом самой пожилой роженицей в мире. Об этом сообщают сотрудники больницы в Барселоне. Имя женщины не называется. По словам врачей, она забеременела после лечения от бесплодия в Южной Америке. Женщине было сделано кесарево сечение. До этого у 67-летней испанки не было детей.

До сих пор самой пожилой роженицей считалась румынка Адриана Илиеску, которая в 2005 году в возрасте 66 лет родила девочку. Девочка родилась раньше срока. Женщине пришлось делать кесарево сечение после того, как второй близнец умер в утробе матери.

Пеликан, который влюбился... в женщину

Розовоспинный пеликан, сородичи которого живут в Африке к югу от Сахары, в октябре сбежал из парка диких животных на острове Мэн и улетел в Нортумберленд, где его обнаружили с заражением крови.

Птица, заботу о которой взяло на себя Шотландское общество борьбы с жестоким обращением с животными, вскоре стала выказывать внимание Алексис Бейли, одной из сотрудниц этого общества. Пеликан стал исполнять брачный ритуал, когда она входила в комнату, и щипать всех, кто к ней приближался.

47-летняя миссис Бейли, работающая в обществе вот уже восемь лет, рассказала, что никогда прежде не видела ничего подобного. *"В одну из октябрьских ночей к нам поступил звонок о больном пеликане, я как раз дежурила,* — рассказывает она. — *Я приехала, ввела ему антибиотики и забрала его на ночь. С тех пор он, похоже, в меня влюбился". "Он смотрит мне прямо в глаза и делает то, что я могу назвать лишь брачными играми, — поднимает крылья и склоняет голову. Он подходит ко мне, прижимается и начинает меня прихорашивать. Он любит взять в клюв мои волосы или руку, ему нравится играть со шнурками у меня на ботинках".*

Миссис Бейли добавляет: *"По какой-то причине он ведет себя так лишь со мной. Если меня поблизости нет, то он согласен, чтобы его кормил рыбой кто-то другой. Но как только я появляюсь, он начинает нападать на других людей". "Он встает между другим человеком и мной, поднимает крылья и бросается вперед, раскрывая и закрывая свой большой клюв. Если этот человек не уйдет поскорее, то пеликан начнет щипаться. Меня это очень тревожит, ведь я знаю, что это очень больно. Он щипал сотрудников, добровольцев и ветеринара".*

The Times.

Народная Воля http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

Хопіць нам саромецца свайго...

Помніцца, у эпоху брэжнеўскай стабільнасці (застою) нават тэксты на тэхнічныя тэмы пачыналіся са слоў: “Як адзначыў у сваім дакладзе Леанід Ільіч, ...”.

Таму свой тэкст я пачну класічна: *як адзначыў* у адной са сваіх прамоў Аляксандр Рыгоравіч, “беларускую мову мы падтрымліваем...” Ура! Хацелася б толькі, каб гэтыя словы напоўніліся зместам, сталіся, так бы мовіць, кіраўніцтвам да дзеянняў “вертыкальных” начальнікаў.

А тут якраз і нагода, каб пацвердзіць на практыцы словы кіраўніка краіны: “мэр” Мінска Міхаіл Паўлаў даў загад правесці інвентарызацыю ўсіх рэкламных шчытоў на сталічных вуліцах. Пры гэтым зазначыў, што рэклама павінна быць эстэтычнай і ўпрыгожваць горад, а не псаваць ягоны знешні выгляд.

Зноў жа — ура! Як жыхар Мінска я падтрымліваю сп.Паўлава. *Як грамадзянін Рэспублікі Беларусь патрабую, каб не менш чым у палове рэкламных шчытоў моваю тэксту стала беларуская мова.*

Такая падтрымка беларускай мовы паспрыяе пачуццю гонару **за Беларусь** у грамадзян нашай краіны і выкліча павагу гасцей з бліжняга і дальняга замежжа.

Хопіць ужо нам саромецца свайго! І давайце пачнём абмяркоўваць лёс краіны на сваёй роднай мове. Тады, веру, мы хутка пераканаемся, што дамаўляцца стане лягчэй...

Мікола ШАФАРЭНКА,
грамадзянін
Рэспублікі Беларусь.

ПАСПРАЧАЕМСЯ?

Пра «Нобеля» і яго беларускія асаблівасці

Апошнім часам проста распірае жаданне выказацца з нагоды, якая не дае спакою шмат якой амбіцыйнай галаве. А нагода гэтая — ці ёсць рэальная магчымасць атрымаць беларусам доўгачаканую Нобелеўскую прэмію? І гэта не адыёзныя амбіцыі, бо наша нацыя мае сапраўды вялікія культурныя набыткі, асабліва што тычыцца літаратуры і паэзіі. І гэта прызнаём — зусім аб’ектыўна — не толькі мы самі.

Здаецца, пытанне мусіла было ўжо вырашыцца даўно. Але прычыны, з якіх гэта не адбылося, мы разумеем добра. Яны надзвычай сур’ёзныя. Хіба не так? Цягам апошніх двух стагоддзяў з нас — асвечанай і цывілізаванай нацыі — жадалі зрабіць халопаў і быдла, і каб іншы свет глядзеў на нас, як на халопаў і быдла...

Тую прэмію, што азначае аўтарытэтнейшае прызнанне выключнасці духоўнага, жыццёвага і творчага шляху намінанта, з беларусаў маглі б, на маю думку, яшчэ ў мінулым атрымаць па ўсёй справядлівасці **Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Алесь Гарун, Максім Гарэцкі, Язэп Пушча, Уладзімір Дубоўка, Алесь Акула, Наталля Арсеннева, Ларыса Геніюш, Уладзімір Караткевіч, Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Янка Брыль...**

Але, на вялікі жаль, мы вечна сядзелі і сядзім пад чыімсьці культуралагічна-палітычным прэсінгам. І Беларусь, адна з самых развітых культурных абсягаў у былым СССР, была пад жахлівым ідэалагічным ціскам, як, зрэшты, і ўсё савецкае мастацтва “сацыялістычнага рэалізму”, дзе нацыянальнае прызнавалася, у лепшым выпадку, як фармальна-дэкаратыўная абалонка, “форма”. Панавала ж у Краіне саветаў усё праімперска-рускае...

Вось чаму заходнімі дэмакратамі ў разлік сусветнага кантэксту бралася найперш расійская (руская) культурная спадчына. Было б нонсенсам, калі б ганаровую Нобелеўскую прэмію атрымаў нехта з “ускраін” СССР, хоць бы і варты яе не менш, чым, скажам, французы Камю і Сартр ці расіяне Бунін і Шолахаў...

Тое, што на Захадзе ўся савецкая культура асацыіравалася найперш з расійскай, было, напэўна, выгадна для яго: не трэба лішні раз напружвацца дзеля паглыблення і ўспрымання нацыянальных культур за “жалезнай заслонай”. Інерцыя такога мыслення працягваецца, нават калі заслона тая ўпала. Ды і са “сваіх”, заходніх, прэтэндэнтаў чарга не змяншаецца! Карацей, як у той показцы: “Кремлевская стена (чытай — ”Нобелеўскія" пакоі) не могла принять всех желающих!" Мо таму акрамя прэмій адпаведнага кшталту Янку Маўру і Васілю Вітку — за выключную “дзіцячую” творчасць — мы, беларусы, з сусветных лаўраў атрымаць большага не мелі права і магчымасці?

Зараз Беларусь — самастойная суверэнная дзяржава, хоць і не ў поўным тэрытарыяльна-духоўным кантэксце. І пытанне “Нобеля” для беларусаў як адной з самых старажытных, духоўна і культурна развітых нацый у Еўропе паўстае ўсё часцей і часцей. Але застаецца адкрытым пытанне для нас саміх: каго ж мы, беларусы, можам сёння “без промаху” прапанаваць у кандыдаты на атрыманне самай прэстыжнай літаратурнай прэміі ў свеце?

Адштурхоўвацца варта, лічу, найперш ад прынцыпу выключнай выбранасці ў духоўным і творчым набытку пісьменніка. Гэтае пытанне лепш было б вырашаць не закрытым пасяджэннем ПЭН-клубаўцаў, якія, зразумела, не пазбаўлены суб’ектызму, а шляхам зандзіравання шматпалярнай грамадскай думкі. Можна называць розныя імёны насамрэч выдатных пісьменнікаў, вартых пашаны і павагі, якія зрабілі важкі ўнёсак у скарбонку нашай літаратуры. І тут асоба народнага паэта Рыгора Барадуліна, безумоўна, варта разгляду. Гэта творца, які можа ў паэзіі ўсё! Маецца на ўвазе найперш выключны мастацкі ўзровень ягоных твораў. Але, на мой погляд, і яго ёсць у чым папракнуць, як мне, ягонаму вучню, гэта ні балюча пісаць.

Справа ў тым, што поруч з любоўнай лірыкай касмічнага ўзору, ад якой будзе зносіць галаву яшчэ не аднаму пакаленню маладых беларусаў і беларусак, або існа-духоўнабоскімі “Кстамі” і “Евангельлем ад мамы” ў творчай біяграфіі паэта стаіць, да прыкладу, зборнік “Строгая вымова” (“Мастацкая літаратура”, 1976 г.) — апалагетыка сумніўных камуністычных культаў... І гэта, на жаль, не адзіны “кастрычніцкі падарунак” ад нашых патрыярхаў...

Можна, канешне, сёння зрабіць зразумелую скідку на час, але, як кажуць, з песні слова не выкінеш. Між тым быў і іншы шлях — шлях Караткевіча, які ніколі не здраджваў сабе, хоць каштавала гэта яму здароўя і жыцця. Таму і пісаў ён пра ледзь не забароненага тады Кастуся Каліноўскага, на вобразе якога выхоўваецца ўжо не адно пакаленне беларускай моладзі.

Такіх рыцараў без страху і папроку, як Караткевіч, было, па праўдзе, не шмат. Таму так “паспахова” нішчылася — і нішчыцца ў Беларусі ўсё беларускае, адбывалася — і адбываецца — татальная дэбеларусізацыя: ёй не было мужнага масавага супраціўлення, і перш за ўсё з боку нашай творчай эліты, а таксама шырокіх колаў інтэлігенцыі. Руйнаванне гістарычнай спадчыны, заняпад духоўных каштоўнасцяў, навязванне комплексу нацыянальнай непаўнавартаснасці, фізічная і маральная дэградацыя нацыі — дагэтуль канца таму не відаць... Дажыліся да таго, што маё пакаленне на ўжо побытавым узроўні вымушана неверагоднымі высілкамі дабівацца беларускамоўных садкоў і школ для сваіх дзяцей, адстойваць свае грамадзянскія правы ў міністэрствах, судах, ЖЭСах, іншых дзяржаўных установах, прымушаючы паважаць сябе, прадстаўнікоў тытульнай нацыі, у сваім родным доме, сваёй краіне!

Вялікая доля віны за ўсё гэта кладзецца на “валадароў слова”, якія нярэдка маўчалі там, дзе трэба было біць у набат.

Ды хто ж насамрэч варты той самай узнагароды, якая, падкрэсліваю, адлюстроўвае не толькі выключны ўзровень мастацкага слова, але і духоўнага аблічча творцы? На маю думку, гэта найперш — **Вітаўт Чаропка, Віктар Тарасаў** (чаго варты толькі адзін яго раман “Пагоня на Грунвальд”), **Алесь Наварыч, Андрэй Федарэнка** — яркія прадстаўнікі сучаснай нацыянальнай прозы: іх творы, перакладзеныя на іншыя мовы, маюць рэзананс далёка за межамі Беларусі. Мяркую, што ў дадзеным кантэксце варта разважаць і пра драматургічную працу **Аляксея Дударава** і **Алены Паповай**. А з паэтаў, якіх у нас, як з рогу багацця (нездарма Беларусь называюць Краем паэтаў), можна назваць хаця б **Валянціну Аксак** ці **Галіну Дубянецкую, Наталлю Кучмель** ці **Сяргея Верацілу**. І гэты спіс можна доўжыць.

Але толькі, зноў жа, варта помніць пра Дар Божы, разумеючы, што ён прыналежны да **таго самага Найвышэйшага Служэння!**

Сяргей ПАТАРАНСКІ.

АД РЭДАКЦЫІ

Погляд аўтара гэтага артыкула, магчыма, падзеляць не ўсе чытачы. Таму, прадаставіўшы слова Сяргею Патаранскаму, рэдакцыя “Народнай волі” выказвае гатоўнасць даць магчымасць выказацца па закранутай тэме ўсім, каго яна хвалюе. Паспрачаемся?

ТВОРЧЕСТВО ЧИТАТЕЛЕЙ

Не дай свинье, Всевышний, роги, а человеку — пятачок...

По гороскопу 2007 год — год Свиньи. Какое раздолье предоставило это животное для тех, кто любит рифмовать. Среди таких немало наших читателей. Вот и минчанин Евгений Козюкин поупражнялся в этой теме.

Шагал я лесом за метелью,
Бросая взгляд по сторонам,
И вижу я: стоит под елью
Огромный огненный кабан.
От удивления присвистнув,
— Привет, хрю-рю! —
сказал вдруг я.
А он в ответ:
— Зачем по-свински?
Я Новый год, а не свинья.
Ну, как дела? —
спросил он звонко,
Сама святая простота,
А я в ответ: — Гниет соломка,
Да и в корытах пустота.
И есть в округе люди-хрюшки,
И даже выведена ветвь,
Что могут хрюкать
у кормушки
И бесконечно кабанеть.
Хоть в лыч исправно получают
И каждый стойлом
так зажат,
Но все хвостишками виляют,
И все от радости визжат.
Мои, послушав монологи,
Сказал кабан мне бодрячок:
— Не дай свинье,
Всевышний, роги,
А человеку — пятачок.
Пусть мы нутром
с вами похожи,
О чем твердят
не первый век, —
Никто свинью
вам не подложит,
Лишь человеку человек.
Но хватит всем
в грязи валяться,
Князьям заборы подпирать,
Чтоб Новый год принес
нам счастье,
Пора бокалы поднимать!
Давай для дела, для единства
Нальем не пойла, а вина...
Не надо вдрызг, не надо
свинства, —
Удачи всем и всем добра!

Евгений КОЗЮКИН.

ЧИТАТЕЛЬ — ЧИТАТЕЛЮ

Сами виноваты, что не живем, а прозябаем...

Пишу в ответ на письмо Инны Константиновой из г.Минска, напечатанное 24 ноября под заголовком “Почему я, получив два высших образования и проработав на государство 45 лет, заработала лишь на прозябание?”. Конечно, такие публикации вызывают сочувствие, но, читая их, хочется задать вопрос: “А что сделано нами самими для улучшения этой ситуации? Где мы были, когда принимались важнейшие решения, касающиеся нас и нашей дальнейшей жизни? Какое влияние оказали мы на окружающих нас людей, на молодое поколение, идущее нам на смену?” Я думаю, что сделано крайне мало. Поскольку не каждому удалось получить высшее образование, то люди, имеющие его, тем более два, и одно из которых политическое, могли бы сделать больше. Могли, но не сделали. Своя рубашка оказалась ближе к телу. Ведь в таком случае можно было и не удержаться 45 лет на высокооплачиваемой должности. Вот и пожинаем сейчас плоды своей беспечности и безответственности.

Оглядываясь на прожитые годы, я сейчас думаю, что тоже не всегда поступала, повинуясь чувству долга. Вспоминаю, как три года назад мой младший сын, окончив школу и не поступив в институт, отправился в службу занятости, чтобы встать на учет. Но, вернувшись оттуда, сказал, что на учет его не поставили, так как пособие по безработице ему все равно не назначат, потому что у него нет отца. К тому времени мой муж уже умер. Не поверив ему, я позвонила в службу занятости, где мне разъяснили, что, поскольку я как мать получаю на него пенсию по случаю потери кормильца (ему в тот момент было 17 лет), то считается, что мой сын имеет доход в отличие от его одноклассника, у которого есть отец и которому пособие назначили. Видимо, законодатели посчитали, что зарплата отца одноклассника, превышающая пенсию в несколько раз, доходом не считается. Получается, что если ребенок уже обделен самой жизнью, так нужно обделить его еще больше. Как это не вяжется с декларируемыми принципами защиты самых обездоленных! Я тогда тоже не стала придавать этому случаю особого внимания, так как считала его единичным и нетипичным.

Да и сколько таких случаев было на протяжении жизни! Но ведь кто-то тоже мог оказаться в подобной ситуации, и думать нужно, наверное, не только о себе, но и о других и пытаться как-то исправить положение. Но мы спохватываемся только тогда, когда это коснется нас лично. Я уверена, что мы всегда должны думать о том, какую страну мы оставим своим детям и внукам, будет ли их жизнь в ней удобной и комфортной, и будут ли они чувствовать себя в ней свободными.

С уважением —

Нина Ивановна БАХАНОВИЧ,
жительница
г.Старые Дороги.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ...

Я водитель с большим стажем. На днях вспомнил, что мне в январе 2007 года нужно пройти очередное медицинское обследование. Слышал, что в Минске теперь справки водителям выдают не только в специализированной поликлинике, что рядом с центральным железнодорожным вокзалом, но и в других местах.

Не могла бы “Народная воля” назвать более точные адреса?

Сергей КУЛИНКОВИЧ,
житель г.Минска.

Поликлиники г.Минска, в которых выдают медсправки водителям:
Центральный район — п-ка №1.
Ленинский район — №6.
Фрунзенский район — №2.
Заводской район — №21.
Октябрьский район — №3.
Партизанский район — №14.
Первомайский район — №28.
Московский район — №32.
Советский район — №34.

РЭХА

Кланяюся да зямлі гэтай незвычайнай жанчыне

Дзень добры, шаноўная “Народная воля”!

Дзякуй, што друкуеш матэрыялы, якія адгукаюцца ў душы, не даюць ёй счарсцвець і прымушаюць думаць, нешта пераацэньваць у сваім уласным жыцці.

Такім стаўся для мяне нарыс “Жанчына, якая любіць жыццё, паэзію і кветкі”, прысвечаны былой вязніцы ГУЛАГу, сапраўднай гераіні Беларусі Надзеі Раманаўне Дземідовіч. Які страшны лёс выпаў ёй, колішняй маладзенькай дзяўчыне, хоць гэта, на жаль, зусім не выключэнне ў лёсах людзей старэйшага веку. Але больш за ўсё ўражвае і выклікае захапленне маральная вышыня, чалавечая годнасць і сіла волі, якія не далі ёй зламацца ў неверагодна жудасных нават па тым часе выпрабаваннях і пакутах.

Такое пад сілу вытрымаць далёка не ўсім мужчынам. Разважаю на гэты конт зусім не тэарэтычна. Не стану дакараць іншых. Буду шчырым і набяруся духу прызнацца, што ведаю гэта на ўласным прыкладзе. Не, мне і сотай долі не давялося зведаць таго, праз што наканавана было прайсці Надзеі Раманаўне. Але і мой лёс быў пакручасты, віхурысты, я ледзьве ўстаяў на нагах. Адзін час (што было, тое было, не хаваю гэты не самы ўхвальны момант сваёй біяграфіі) я моцна запіў. Закінуў пісаць вершы, мог страціць сябе як чалавек (а колькі такіх, як я ў тую пару!). Ды ўсё-такі здолеў узяцца за галаву, ачомацца: што раблю, дурань? Хай сабе і цяжка, але трэба жыць па-людску, сплачваць даўгі перад маці-Радзімай, не кідаць яе ў бядзе. Я ж грамадзянін сваёй краіны, а не духоўны бомж-інвалід нейкі...

З гэтым усведамленнем і пачаў новае жыццё. Усім цікаўлюся, прымаю блізка да сэрца. Хвалююся за ўсё, што адбываецца з Бацькаўшчынай. Сябрую з маладзёнамі, на якіх надзея: яны спраўдзяць тое, чаго не здолелі людзі майго пакалення. Перапісваюся з сасланым на лесапавал цудоўным чалавекам, маладзёжным лідэрам і бліскучым публіцыстам Паўлам Севярынцам, дасылаю яму свае вершы грамадзянскага накірунку.

Мне здаецца — і гэта дае сілу жыць, — што повязь пакаленняў, дзякуй Богу, не перарваная. Адчуваю гэта, кантактуючы з 20-гадовымі хлопцамі, адданымі ідэі Нацыянальнага адраджэння Айчыны. Мне ўжо 76, але мы не адчуваем розніцы ў гадах. Бо ў нас, такіх розных, адзін інтарэс, адно памкненне: незалежнасць і шчасце роднай краіны, нашых людзей. Сярод нас, з намі, нябачна прысутнічае і Надзея Раманаўна Дземідовіч — жывы ўзор нязломнасці ў змаганні за тое, у што свята верыш. Ахвяраваў ёй (і прашу, калі можна, перадаць), а таксама яе духоўнаму нашчадку Зміцеру Дашкевічу, асуджанаму да турэмнага зняволення, верш. Пісаў яго з надзеяй, што

...воля, людзі,
Не можа проста дацца,
За яе належыць
Добра пазмагацца.

Веру: хоць зараз цяжка, вельмі цяжка даводзіцца сумленным, неабыякавым людзям, сапраўдным патрыётам — многіх пераследуюць, штрафуюць, кідаюць за краты — нашай адданасцю і любоўю ў муках народзіцца Новая Беларусь. Упэўнены, што намаганні і ахвяры папярэднікаў былі недарэмныя. У гэтым зноў і зноў пераконвае жыццёвы і грамадзянскі подзвіг звычайнай — і разам з тым незвычайнай жанчыны Надзеі Раманаўны Дземідовіч, якой кланяюся да самай зямлі і зычу ўбачыць на яве тое, чаму прысвяціла яна сваё жыццё.

Мікалай КУКСО,
жыхар г.п.Івянец
Валожынскага раёна.

ЗАДУМАЕМСЯ

«Як расліне кожнай глеба...»

Мяне, дый не толькі мяне, турбуе, чаму на Беларусі — нібыта ўжо суверэннай — не ўсё як у людзей. Нават многае дагары нагамі: ліквідуюцца беларускамоўныя школы, няма нацыянальнай вышэйшай адукацыі, не ў пашане беларускамоўныя газеты, нават тыя, што ўжо сталіся ў нашай гісторыі легендаю. Воляй якіхсьці “звышразумнікаў” наша родная мова ў роднай краіне амаль цалкам выгнана з усіх абсягаў і куткоў.

“Без мовы няма галовы”, — сцвярджае народная мудрасць. Лепшыя беларускія галовы, найвыдатнейшых нашых творцаў праз усё жыццё турбавала моўная дысгармонія на Беларусі. У тым ліку — і знанага байкапісца і мовазнаўцу Кандрата Крапіву. Яшчэ ў далёкім 1922 годзе, на заранку свайго творчага шляху, будучы народны пісьменнік і акадэмік даў належны адлуп моўным гора-тэарэтыкам у сваім сатырычным вершы “Шчыраму латыністу”.

Верш гэты малазнаны цяперашнім чытачам. А між тым ён і сёння, мне падаецца, не страціў сваёй надзённасці, б’е ў самую кропку. Праўда, тут трэба зрабіць, у адпаведнасці з часам, некаторыя карэктывы. Аўтар тагачаснага пражэкта — замяніць у школах вывучэнне беларускай мовы на латынь — яшчэ не ведаў, што яго ідэя амаль што здзейсніцца: мову родную выганяць, толькі яе месца зойме не лацінская, а руская...

Прапаную ўвазе чытачоў даўнюю публікацыю верша **Кандрата КРАПІВЫ,** датаваную 1922 годам (арфаграфія захоўваецца). Ён надрукаваны ў тагачаснай газеце “Савецкая Беларусь”, якая выходзіла на беларускай мове з 1922 да 1933 г. і была трыбунай нацыянальнай інтэлігенцыі.

Уладзімір СОДАЛЬ.

Шчыраму латыністу

“Што вы, людзі!? Што вы!?
Што вы!? —
Ня было таго ніколі,
Каб у нашай роднай школе
Беларускай нейкай мовы
Шэсьць гадзін было на тыдні, —
Яна ж дзецям аж абрыдне,
Ды няма з яе карысьці —
Забіваць адно галовы,
Лепш ужыць французскай мовы
Ды латынскай, як калісьці!..”
Кажуць нават, што нядаўна
Хтось унёс праэкт, каб далей
У нашых школах выкладалі...
Па-кітайску (вось забаўна!),
Беларус жа роднай мовы
Каб ня мог ужыць і слова.
Трэба й мне адукавацца,
Бо й “Савецкай Беларусі”
Давядзецца скора, мусіць,
Па-кітайску друкавацца...
Латыніст заядлы, шчыры!
Пралупі ты зрэнкі шырай
Ды на дол спусьціся з неба,
Наш таварыш безгаловы,
Дык убачыш, што нам мова
Беларуская тут трэба,
Як вада, як кавал хлеба,
Як расьліне кожнай глеба.

КРАПІВА.

11-XI-22 г.



На здымку: *Кандрат Крапіва (пачатак 20-х гадоў XX стагоддзя).*

МЕРКАВАННЕ

Можа, абыдземся без эксперыментаў?

Галоўныя аргументы на карысць будаўніцтва АЭС такія: па-першае, у мэтах энергетычнай бяспекі трэба пазбавіцца залежнасці ад аднаго пастаўшчыка газу і нафты ў Беларусь; па-другое, Беларусь вельмі шмат грошай траціць на закупку ў Расіі энерганосьбітаў. Аргументы здаюцца бясспрэчнымі толькі на першы погляд. Судзіце самі.

Мы спрабуем вылезці з-пад расійскага ўплыву на сітуацыю з энерганосьбітамі і адначасова разглядаем магчымасць будаўніцтва АЭС расійскімі спецыялістамі, з расійскім рэактарам, на расійскім ядзерным паліве (бо свайго не маем) і з перспектывай захоўвання ядзерных адходаў у Расіі. Дык пра якое пазбаўленне ад залежнасці гаворыцца? На каго разлічаны гэтыя аргументы?

Сапраўды, энергетычная бяспека — вельмі важны аспект дзяржаўнай бяспекі. І не нармальная сітуацыя, калі адна краіна забяспечвае амаль увесь аб’ём энерганосьбітаў, патрэбны нашай эканоміцы. Але ці можна лічыць сапраўды сур’ёзным аргументам тое, пра што гавораць беларускія лабісты “атамнага праекта”: маўляў, калі на газаправодзе здарыцца аварыя, то ў краіне будзе сапраўдны энергетычны калапс. Можна падумаць, што калі здарыцца аварыя на АЭС, калапса не будзе. А можа, наступствы “атамнай аварыі” менш страшныя? Зразумела, што не. Зразумела, што мы маем справу з простай адгаворкай.

Не будзе перабольшаннем сказаць, што галоўная праблема, з-за якой прынята рашэнне аб будаўніцтве АЭС, — грошы. Сапраўды, наша краіна вельмі шмат сродкаў траціць на аплату энерганосьбітаў, але толкам так і не высветлена — чаму. Добра вядома, што ў спажыванні газу на кожнага чалавека мы “чэмпіёны свету” — расходуем у два разы болей, чым Германія, і столькі ж, колькі ЗША. Але ці можна параўнаць нашу прамысловасць і прамысловасць ЗША? Чаму ў Германіі паўсюль і ветракі, і сонечныя батарэі, а нам усё гэта не патрэбна — адразу падавай АЭС?

Чаму ва ўсім свеце стаўка робіцца на праграмы энергазбяражэння, а мы колькі ні ўкладвалі грошай у гэтыя праграмы, ніякай эканоміі так і не дабіліся. Можа, перш чым будаваць АЭС, пашукаць рэзервы ў сябе пад носам?

Для сур’ёзных эканамістаў бясспрэчна: ці будзе атамная энергія, ці традыцыйныя энерганосьбіты, беларуская эканоміка не стане канкурэнтаздольнай да таго часу, пакуль на нашых прадпрыемствах не запрацуюць сучасныя тэхналогіі. А калі знос асноўных фондаў на прадпрыемствах складае 80%, то пра якую эканомію і пра якую канкурэнтаздольнасць мы гаворым? Са школьных часоў многія памятуюць пра існаванне такога паказчыка, як ККД (каэфіцыент карыснага дзеяння). Помнім мы і тое, што калі абсталяванне электрастанцый, заводаў, камунальных сетак састарэлае, то і ККД робіцца ўсё ніжэй і ніжэй. Вось так і адбываецца, што мы бухаем энерганосьбіты як у бяздонную печ. І год ад году нам іх трэба ўсё болей і болей.

Ці не лепей будзе тыя 3—4 мільярды долараў, што плануецца пусціць на будаўніцтва АЭС, укласці ў пераабсталяванне найбольш энергаёмістых вытворчасцяў і ў праграмы сапраўднага, а не міфічнага энергазбяражэння? Колькі ж можна праводзіць эксперыменты на сваім народзе?

І.Г.КАРАЛЕЦ.

г.Мінск.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
4 СТУДЗЕНЯ 2007 г.

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

Расплата за каханне

Жончын позірк вострай шпагай працінаў яго наскрозь, і Арнольд похапкам збіраў у дарожную сумку ўсё, што меўся ўзяць з сабой. Нават не зачыніўшы замок-маланку, выйшаў на лесвічную пляцоўку, націснуў кропку ліфта.

— Каб ты не вярнуўся! — са злосцю крыкнула жонка. — Можа, цябе хто нарэшце прыдушыць у тым Валанчэрску!

Арнольд не слухаў. Ён ускочыў у ліфт і, спусціўшыся ўніз, сеў у машыну, якую загадзя паставіў ля пад'езда. Душа спявала, бо ён (у каторы ўжо раз!) ехаў да каханай жанчыны, якая жыла амаль за трыста кіламетраў ад Мінска. Аднойчы пазнаёміўся з Вікторыяй на аўтавакзале сталіцы: дапамог ёй паднесці цяжкі багаж. Разгаварыліся. Яна сказала, што працуе бухгалтарам у адным з раённых гарадкоў. Была замужам, развялася. Адна выхоўвае сына, які неўзабаве скончыць школу.

Вікторыя была амаль на пятнаццаць гадоў маладзейшая за яго і даволі прыгожая.

Яны абмяняліся тэлефонамі, і Арнольд амаль штодзень пачаў званіць ёй у той далёкі Валанчэрск. А праз які месяц Арнольд сабраў у сумку гасцінцы і паехаў да Вікторыі.

Яны сустракаліся часта. Арнольд працаваў у ахове адной з фірм і, дзяжурачы суткі, меў трое сутак вольных.

Ён так закруціўся ў віхуры новага кахання, што забыўся пра дом і сям'ю. Жонка адна ўбірала ўраджай на дачным участку, ездзіла да дачкі, што з мужам і малым дзіцем жыла на другім канцы горада. Ён жа і наяву, і ў снах бачыў адну толькі Вікторыю. Купляў ёй дарагія падарункі, прывозіў цэлыя сумкі прадуктаў...

Нарэшце яго машына прытармазіла ля знаёмага дома на ціхай местачковай вуліцы. У адным з пакояў акно было прыадчынена і з яго лілася вясёлая музыка, чуліся п'янаватыя галасы.

Ён узяў з багажніка сумку і накіраваўся да ганку. Дзверы па-вясковаму звычаю былі не замкнёныя, і ён адразу ж трапіў у прыхожую. Убачыў, што яго Вікторыя сядзіць на каленях у незнаёмага пажылога чалавека, што на выгляд гадзіўся ёй у бацькі. Яны то п'янавата хіхікалі, то цалаваліся. Нават не пачулі гул Арнольдавай машыны і таго, як стукнулі дзверы.

— Не сумуеш тут без мяне, — не то спытаў, не то пацвердзіў Арнольд. У яго голасе былі ноткі рэўнасці.

— А гэта хто такі? — спытаўся пажылы чалавек. — Мы гасцей не чакаем, праўда, Віка?

— Яшчэ невядома, хто тут госць, — ужо са злосцю прамовіў Арнольд. — Вымятайся адсюль, дзядзька, пакуль цэлы!

Злая грымаса перакасіла твар п'янага мужчыны. Ні слова не кажучы, ён схапіў са стала бутэльку з недапітай гарэлкай і гвазданў ёй аб край стала. Моцна трымаючы за рыльца, усадзіў вострыя асколкі шкла проста ў шыю Арнольду. Той захрыпеў, упаў на падлогу. Мужчына не адпускаў бутэльку да таго часу, пакуль Арнольд не заціх. Вікторыя стаяла побач і з жахам назірала за ўсім, што адбываецца ў яе хаце. Кроў нацякла на дыван, запырскала яе белыя туфлі. Побач валялася сумка з гасцінцамі, што прывёз Арнольд.

— Ты што, закамянела?! — крыкнуў забойца. — Дапамажы закруціць труп у дыван, а потым выганіш з гаража сваю машыну і павязём яго ў лес, закапаем.

— Можа, трэба кроў з падлогі змыць? — Вікторыя ўжо выйшла са здранцвення і першая думка, якая прыйшла ў затуманеную алкаголем галаву: хутчэй ратаваць сваю скуру! У душы нават не варухнуўся жаль да чалавека, які закахаўся ў яе.

Яна дапамагла свайму старому кавалеру вывезці труп у лес, туды, дзе пачыналася гнілое балота.

Да раніцы замылі ўсе сляды і, выпіўшы, спакойна заснулі.

Недзе праз тыдзень стары дзед Лявон пагнаў пасвіць кароў і адна з іх, сівая рагатая Гурба, адбілася ад статку, згубілася. Пакінуўшы статак на сваю нявестку, дзед пайшоў шукаць Гурбу. Ён здалёк пачуў, як яна раве недзе ў гушчары ля балота. Карова драла капытамі зямлю пад кучай ламачча: яна знюхала кроў.

Пра ўсё гэта дзед паведаміў участковаму міліцыянеру. А яшчэ праз якой паўгадзіны ў мястэчка прыехаў са сталіцы сябра Арнольда, які быў у курсе яго амурных спраў. Ён шукаў сляды Арнольда, які тыдзень таму паехаў да каханай і да гэтага часу не вярнуўся. На рабоце паднялі трывогу.

Труп адкапалі. Забойцаў знайшлі і да суда пасадзілі за краты.

Трэба было хаваць нябожчыка, ды не было каму. Бацькі яго даўно паўміралі, а жонка наадрэз адмовілася:

— Я яму шчыра жадала смерці, бо сваімі паездкамі і непрыхаванай здрадай выматалі ўсе нервы. Ён забыўся, што я таксама чалавек і што ў мяне ёсць душа, якая пастаянна нібы пяклася на агні. Ёсць-такі справядлівасць на свеце! — гаварыла яна.

Арнольда хавала ягоная фірма.

Людзі казалі, што Вікторыя, каб яна нават не была арыштавана, таксама па Арнольду не плакала б. Аказваецца, ён быў у яе не адзін. А такія жанчыны ні любіць, ні плакаць не ўмеюць...

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.

Дзятлаўскі раён.

АДУСЮЛЬ

Біндзікаў ідзе на рэкорд

Рэкардсмен Кнігі рэкордаў Гінеса Аляксандр Біндзікаў з Магілёва мае намер пабудаваць піраміду з 8 тысяч запалак. Яна будзе трымацца на чатырох запалках, якія стаяць вертыкальна. Магіляўчанін запланаваў сваю акцыю на пачатак студзеня 2007 года. Рэкорд ён будзе спрабаваць устанавіць у Мінску. Раней Аляксандр Біндзікаў будаваў усемагчымыя канструкцыі з касцяшкаў даміно, крышачак ад піўных бутэлек і манет, зазначае агенцтва БЕЛТА.

Знёс палову хаты

У Маладзечанскім раёне шматтонны "МАЗ" заехаў у вясковую хату ў вёсцы Гранічы. Здарэнне адбылося за лічаныя секунды. Аўтамабіль не ўтрымаўся на слізкай дарозе і заехаў у рог хаты. Гаспадарам дома пашанцавала: яны абышліся пашкоджанымі сценамі ды знішчаным тэлевізарам. Кіроўцу пашэнціла менш: яго даставілі ў бальніцу з закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і ранамі твару. Нялёгка было дастаць машыну: выратавальнікі мусілі скарыстацца бензарэзамі.

Знойдзены незвычайныя валуны

На Лепельшчыне паміж вёскамі Марозава Слабада і Мягель выяўлены незвычайныя валуны. Яны ляжаць каля льнянога поля. У іх прасвідраваны дзіўныя адтуліны, якія дасягаюць дзесяці сантыметраў у глыбіню і паўтара — у дыяметры. Зараз вяскоўцы шукаюць спецыялістаў, якія ім патлумачаць, што ж здарылася з валунамі, паведамляе газета "Лепельскі край".

СИТУАЦИЯ

«Будешь знать, как защищать других...»

Крестьяне Бычихинского сельского Совета Городокского района пожаловались местному предпринимателю Василию Ильницкому (который содержит автокемпинг в д.Кузьмино), что даже в конце октября на их подворьях не были убраны зерновые. К тому же совхозное стадо коров, оставленное без присмотра, вытоптало несколько огородов.

Пикантность этой ситуации заключается в том, что местный предприниматель из деревни Кузьмино Городокского района Василий Ильницкий, проявив инициативу, по просьбе сельчан дал телеграмму президенту Республики Беларусь А.Лукашенко и сообщил о безобразиях, которые допущены районной властью. При этом депеша была послана с уведомлением и с просьбой отреагировать на проблему. Более того, в телеграмме сообщалось, что Витебское телевидение и областная пресса ее освещали.

Уже 3 ноября заявителю Ильницкому председатель комитета по сельскому хозяйству Витебского облисполкома Л.Плешко дал ответ: *"...Комитетом с выездом на место рассмотрено Ваше обращение, адресованное Президенту Республики Беларусь А.Г.Лукашенко о непринятии мер Городокским райисполкомом по уборке зерновых на приусадебных участках населения... Факты неубранных участков не подтвердились. По факту потравы огородов коровами КУСХП им.Свердлова установлено, что ни одного письменного обращения в администрацию хозяйства от пострадавших не поступило. По устному обращению гражданина А.М.Степанова, ему выделено в возмещение ущерба бесплатно 400 килограммов зерна согласно акту от 22 октября 2006 г."*.

Правда, в письме не сказано, за что Степанову выделено зерно: за потраву огорода коровами или за несвоевременную уборку урожая. Еще Л.Плешко ссылался на задержку сроков уборки зерновых в связи с тяжелыми погодными условиями. Дескать, выпало осадков в августе—сентябре 237 процентов от нормы. Но крестьянам это объяснять не надо, их возмутило то, что **"факты неубранных подворий не подтвердились"**.

82-летний ветеран войны и труда из деревни Кленовка Александр Михайлович Степанов, инвалид войны второй группы, узнав о бюрократической отписке, со слезами на глазах говорил Ильницкому: *"35 соток овса пропало на моем подворье из-за нерасторопности местной и районной властей. А на некоторых усадьбах не скошено по 50 соток пшеницы, ячменя и т.д. Из моей деревни Окунево ушло на войну 16 парней, вернулись только двое. Посчастливилось и мне остаться в живых, но я был тяжело ранен. После госпиталя опять в бой. Ради чего я пролил кровь? Неужели ради таких, как теперешние представители власти?! Сельсоветчик и выше рангом утверждают, что забота об уборке урожая возложена на того, кто его посеял или посадил. Это же надо, до чего договорились начальники! Куда только смотрит наш всенародно избранный президент? Не пора ли избавляться от говорильни, а строго спрашивать с тех, кому доверено представлять президентскую власть на местах?"*

Фронтовик Степанов также вспоминал: *"Лет 20 назад при Бычихинском сельском Совете была дружина по охране общественного порядка. Дружинники даже встречали на станции поезда, отслеживали, не приехал ли в их местность какой подозрительный тип. Сейчас же в деревнях поголовное пьянство: всем на все наплевать. Раньше в совхозе было 16 комбайнов, 63 трактора. Сейчас осталось 3 комбайна и, может, с десяток тракторов. Сеяли не так давно 800 гектаров ржи, 1400 гектаров яровых и 400 гектаров картошки. Теперь пахотной земли — 700 гектаров. Картошки вообще нет. А хотим много денег. Смех и только!"*

Таковы критические откровения бывшего главного инженера совхоза им.Свердлова А.Степанова.

"Не потерплю такого бездушия по отношению к старым и немощным людям!" — решил В.Ильницкий и покатил в столицу Беларуси в Администрацию президента. Высказал все наболевшее и от себя, и от пенсионеров-колхозников.

"Езжайте, уважаемый Василий Васильевич, к своим сельчанам, — уверенно заявили в приемной Администрации. — *Разберемся, виновные понесут ответственность, ущерб будет возмещен"*.

С трудом верилось Ильницкому, что справедливость восторжествует. Но итогами визита в Минск поделился с деревенской публикой.

И, надо же, визит в столицу принес неожиданные результаты.

Заместитель председателя Витебского областного исполнительного комитета В.М.Бойков на обращение Ильницкого, поданное на личном приеме в резиденции президента Республики Беларусь, дает ответ: **"Подтвердились факты несвоевременной уборки зерновых культур и их частичной потравы скотом на отдельных участках граждан деревень Кузьмино, Малашенки, Кленовка Бычихинского сельсовета Городокского района.**

За невнимательное отношение к рассмотрению Вашего обращения по вопросу несвоевременного обмолота зерновых культур в личных подсобных хозяйствах граждан Городокского района главному специалисту комитета по сельскому хозяйству Т.В.Лопатко объявлен выговор.

По факту потравы личных участков граждан комиссией составлены акты обследования, на основании которых КУСХП им.Свердлова произвело расчет с населением зернофуражом".

Действительно, председателю Бычихинского сельского исполнительного комитета С.И.Белецкому распоряжением райисполкома был объявлен выговор. Директор КУСХП им.Свердлова Ф.П.Колца приказом райсельхозпрода — освобожден от должности директора. Но, справедливости ради, отметим, что Ф.Колца еще за несколько месяцев для всех этих событий подал заявление на увольнение по собственному желанию.

Вот такая история. Но все-таки она не со счастливым концом, плачевно закончилась для защитника обездоленных сельчан — Василия Ильницкого. Городокский райисполком, узрев в деятельности предпринимателя ряд *"нарушений законодательной базы"*, решил ликвидировать придорожный автокемпинг, организацией которого В.Ильницкий занимался восемь последних лет. Все восемь строений, принадлежащих кемпингу в д.Кузьмино велели до 25.12.2006 г. снести *"под нож"*. Эту экзекуцию решением исполкома предложено осуществить самому Ильницкому. Если он этого не сделает, тогда УП "Городокское ПМС" обязали 30 декабря 2006 года сделать это в виде *"новогоднего подарка"* предпринимателю. За его, естественно, счет. Причина — давно истек срок аренды земли. И никого не волнует, что здесь давно построены домики.

Пока начальник ПМК не решился выполнить предписания. Но на случай принудительного сноса строений Ильницкий заготовил восемь портретов А.Лукашенко, которые готов разместить на каждом домике. Ведь Александр Лукашенко в последнее время много говорил о расширении сферы услуг придорожного сервиса...

Владимир ЖИГУЛОВ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Вяртанне Максіма Гарэцкага

На Беларусь перавезены апошнія дакументы архіва сям'і славутага пісьменніка

У Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва новыя бясспрэчна цікавыя паступленні: яго дырэктар спадарыня Ганна Запартыка прывезла з Пецярбурга два чамаданы з архівам сям'і Максіма Гарэцкага. Такім чынам, у Мінск патрапілі ўжо апошнія дакументы з архіва славутага пісьменніка, якія па частках збіраліся ў Беларусі з пачатку 70-х гадоў.

Наша гаворка — з дырэктарам Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва ***Ганнай ЗАПАРТЫКАЙ****.*

— Ганна Вячаславаўна, пачнём з фонду Максіма Гарэцкага: наколькі каштоўныя тыя чамаданы, што Вы толькі што прывезлі ў Мінск?

— Самі па сабе чамаданы — рэч, канешне, музейная, і каштоўнасць яны таксама маюць. Калі я ехала з імі ў цягніку, увесь час думала, што, відаць, з гэтымі чамаданамі Леаніла Усцінаўна і Галіна Максімаўна, жонка і дачка Максіма Гарэцкага, пераязджалі з Кірава ў Ленінград, таму што гэта чамаданы прыблізна 50-х гадоў. Але галоўнае, што гэтыя чамаданы былі напакаваны дакументамі сапраўды ўнікальнымі. Гэта не першае паступленне архіва Гарэцкіх: амаль уся рукапісная спадчына Максіма Гарэцкага паступіла яшчэ на пачатку 70-х гадоў у цэнтральную бібліятэку Акадэміі навук, у нас жа за няпоўныя дзесяць гадоў прыняты асабістыя дакументы, фотаздымкі, дзённікавыя запісы, увесь падрыхтоўчы матэрыял, які быў выкананы Галінай Максімаўнай пры выданні твораў яе бацькі... Што ж датычыцца апошніх паступленняў, дык у дадзеным выпадку размова ідзе пра сямейны архіў. Тут і ксеракопіі і фотакопіі як апублікаваных, так і неапублікаваных твораў Максіма Гарэцкага, яго асабістыя дакументы: пасведчанні, даведкі, членскія білеты і многае іншае; дакументы аб рэабілітацыі Гарэцкага.

— А ці ёсць аўтографы самога Максіма Гарэцкага?

— У асноўным гэта распрацоўкі школьных урокаў, якія ён вёў у Кіраве, калі быў настаўнікам. Між іншым, у гэтых распрацоўках сустракаюцца і імёны Коласа, Купалы і Багдановіча. Хоць гэта было даволі рызыкоўна, таму што Максім Іванавіч знаходзіўся ў высылцы. Што ж датычыцца фотаздымкаў, дык сярод іх ёсць сапраўды унікальныя. Гэта і тыя, якія мы прывыклі бачыць у розных выданнях пісьменніка, — яны ў нас у арыгіналах. Ёсць і такія, якія ніколі не друкаваліся. Напрыклад, ёсць два фотаздымкі: на адным маці Максіма Гарэцкага ў аперацыйнай, незадоўга да сваёй смерці, на другім — маці і бацька зноў жа ў бальніцы. Запіс пра гэтыя фотаздымкі зрабіў у сваёй "Камароўскай хроніцы" сам Максім Іванавіч, але і дасюль было невядома, ці захаваліся яны.

Тут жа вялікая колькасць дакументаў Леаніды Усцінаўны: і асабістыя, і яе рукапісы, дзённікі, лісты, успаміны пра Якуба Коласа. Ёсць і лісты і малюнкі Леаніда Гарэцкага, сына Максіма Іванавіча і Леаніды Усцінаўны, які загінуў на фронце ў 1944 годзе. Самую ж вялікую частку гэтага паступлення складаюць дакументы Галіны Максімаўны. Толькі цяпер высвятляецца, якую тытанічную, неверагодную працу яна правяла! Справа ў тым, што яна ўласнаручна скапіравала архіў бацькі і маці...

— Скапіравала — гэта значыць перапісала?

— Так, па сутнасці зрабіла страхавую копію, копію-абярэг для тых дакументаў, якія былі ўжо ў дрэнным фізічным стане перш за ўсё з-за той паперы, на якой гэтыя рукапісы ствараліся. Акрамя таго, рабіла копіі фотаздымкаў і звярталася ў розныя архівы, музеі, бібліятэкі, да прыватных асоб, якія маглі мець хоць нейкія звесткі пра яе бацьку. Галіна Максімаўна зрабіла працу цэлага інстытута! Мы можам быць толькі ўдзячны ёй, ганарыцца такім вялікім, высокім учынкам дачкі Максіма Гарэцкага.

— Калі будзе апрацаваны фонд Гарэцкага, нас, мабыць, будуць чакаць якія-небудзь адкрыцці?

— Тое, што наш фонд Максіма Гарэцкага дазволіць архівістам зрабіць шэраг цікавых публікацый, а даследчыкам дасць новыя дэталі для спасціжэння яго творчасці, — гэта бясспрэчна.

Сяргей ШАПРАН.

На фота: *Алеся Адамаўна Бабарэка, Галіна Максімаўна Гарэцкая, Ганна Вячаславаўна Запартыка.*

Фота аўтара.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

Літфонд пайшоў на міравую

На продажы "Іслачы" пісьменнікі страцілі 500 тысяч долараў

"Беларускі літаратурны фонд" бясслаўна закончыў судовы марафон па адстойванні сваіх правоў на санаторна-курортны комплекс "Іслач" у вёсцы Ракаў пад Мінскам. Гаспадарчы суд Мінскай вобласці атрымаў з рук Беллітфонду заяву, па якой арганізацыя адмаўляецца ад усіх прэтэнзій да пакупніка "Іслачы" — прыбалтыйскай фірмы "ЛатІнфарм". Гэта фактычны пройгрыш Беллітфонду.

6 верасня судовы выканаўца Гаспадарчага суда Мінска прадала на аўкцыёне шэсць аб'ектаў нерухомасці СКК "Іслач", які належыць (належаў) Беллітфонду. Прадала за 580 тысяч долараў ЗША прыбалтыйскай фірме "ЛатІнфарм". Хаця, паводле афіцыйных экспертных ацэнак, маёмасць каштуе як мінімум 1 мільён 100 тысяч долараў. І другая важная акалічнасць: агульная сума запазычанасці Саюза беларускіх пісьменнікаў і Беллітфонду складала толькі каля 100 мільёнаў рублёў — магасіць яе можна было, прадаўшы адзін толькі гаспадарчы комплекс, а не шэсць будынкаў.

Кіраўніцтва Беллітфонду пераканана: таргоў як такіх зусім не было. Толькі два ўдзельнікі аўкцыёну на такі прывабны кавалак нерухомасці — гэта мізер. Беллітфонд спрабаваў давесці спачатку Гаспадарчаму суду Мінска, а затым — Гаспадарчаму суду Мінскай вобласці, што таргі былі незаконнымі, і патрабаваў паўторных таргоў пры выкананні ўсіх норм законнасці. Гаспадарчы суд Мінска адхіліў скаргу Беллітфонду. А цяпер Беллітфонд уласнымі рукамі пахаваў усе надзеі атрымаць прыстойную капейку за "Іслач".

Літаратурная супольнасць да нядаўняга часу была настроена досыць аптымістычна. Па-першае, новы ўладальнік маёмасці выношвае планы пабудовы на базе СКК "Іслач" рэабілітацыйнага цэнтра і цэнтра па правядзенні пластычных аперацый. У любым выпадку "Іслач" мусіла скарыстоўвацца для добрай справы. Па-другое, зямля, на якой месцяцца пушчаныя з малатка будынкі, па-ранейшаму належыць Беллітфонду. І на гэтай зямлі ў Ракаве, па прызнанні аднаго з кіраўнікоў Беллітфонду, адведзены ўчасткі для пабудовы катэджаў. Пабудаваць прыстойныя невялічкія катэджы, здаваць іх у арэнду, — глядзіш, і набяжыць сякая-такая капейчына.

Гаспадарчы суд Мінскай вобласці 16 лістапада, пачаўшы працэс па іску Беллітфонду па прызнанні таргоў незаконнымі і аб'яўленні новых таргоў, даў бакам — Беллітфонду і пакупніку ў асобе прыбалтыйскай фірмы "ЛатІнфарм" — месяц на дасягненне міравога пагаднення. 19 снежня аказалася, што бакі дагаварыліся. Аднак для Беллітфонду гэтае пагадненне сталася фактычным паражэннем. З атрыманых ад продажу часткі "Іслачы" 580 тысяч долараў на рахунках Беллітфонду яшчэ месяц таму заставаліся толькі 300 тысяч; астатнія пайшлі на пагашэнне запазычанасцяў, на выплату заробкаў ды іншыя дробязі.

Увогуле, за месяц, адпушчаны судом для пошукаў кампрамісу, шмат што адбылося. Справаў аб куплі-продажы "Іслачы" займалася пракуратура; на допыты выклікалі тагачаснага старшыню Беллітфонду Язэпа Янушкевіча, які цяпер спакойна выкладае ў Польшчы. Відаць, пакупніка дасталі так, што на судзе 19 снежня прадстаўнік "ЛатІнфарма" заявіў, што гатовы адмовіцца ад здзелкі — калі, вядома, Беллітфонд верне грошы. А дзе ўзяць гэтыя грошы, калі яшчэ напрыканцы лістапада частку грошай ўласным рашэннем Гаспадарчы суд Мінска спісаў з рахункаў Беллітфонду на карысць структур, якім быў вінен "Літфонд"?

"За гэты месяц "Літфонд" празандзіраваў глебу наконт магчымых пакупнікоў. Аказалася, што за большую суму ніхто "Іслач" не купіць — усе настолькі запалоханы праверкамі пракуратуры, усімі падзеямі вакол комплекса, што папросту ўсе патэнцыяльныя пакупнікі баяцца звязвацца з падобнай здзелкай", — адзначыў намеснік старшыні Саюза беларускіх пісьменнікаў Міхась Скобла.

У чым жа сутнасць міравога пагаднення? Міхась Скобла ў звязку з зададзеным пытаннем працытаваў паэта: "лірыка ліпеня". Ніякіх канрэтных абавязкаў пакупнік на сябе не ўзяў; нават выдзяленне пуцёвак на аздараўленне славутых пісьменнікаў, пра якія "ЛатІнфарм" гаварыў яшчэ на пачатку працэсу, гэтым разам не агаворваецца.

"Бакі змаглі дамовіцца. Беллітфонд адклікае ўсе прэтэнзіі з суда, гэта значыць, адклікае іск, застаецца пры сваіх інтарэсах", — падсумаваў судовую цяжбу Міхась Скобла.

Юрась ДУБІНА.

ЗА ДЕЛО

Госторг здесь неуместен

Суд Молодечненского района и г. Молодечно вынес решение по делу госпредприятия "Госторг". Экс-директор Василий Смоленский и юрисконсульт Вадим Корольков признаны виновными в хищении путем злоупотребления служебными полномочиями на сумму более 100 млн рублей. По приговору, пока не вступившему в законную силу, Смоленский проведет в колонии шесть лет, его подчиненный — пять.

Несмотря на убедительную доказательную базу, с 2003 года суды выносили в отношении Смоленского и Королькова оправдательные приговоры. Только после вмешательства Прокуратуры Республики Беларусь, направившей в Верховный суд очередной протест, обвиняемых признали причастными к правонарушению, арестовав прямо в зале суда. Суды можно понять: создатель и владелец "Госторга" — Молодечненский горисполком (в настоящее время — райисполком). По мнению правоохранителей, именно этот факт позволил руководителям "Госторга" без особенного опасения работать с крупными компаниями, признанными в настоящее время лжепредпринимательскими структурами.

Работа по схемам приносила неплохой заработок. В приговоре отмечено, что, используя поддельные документы, руководители "Госторга" перепродавали дорогостоящее оборудование по цене, в несколько раз превышающей первоначальную. Внушительная прибыль, обналиченная через финкомпании, становилась доходом обвиняемых.

Следствие собрало в уголовном деле пять эпизодов незаконной деятельности руководителя "Госторга" и его подчиненного. Объектом торговых операций, как правило, становились котлы, побывавшие в употреблении. Отыскав оборудование у субъектов хозяйствования, обвиняемые предлагали за котлы свою цену, которая после покупки трансформировалась в сторону увеличения.

Первый эпизод, упомянутый в приговоре суда, касается приобретения, а затем продажи котла российского производства. По данным следствия, "Госторг" купил котел у госпредприятия "Завод глиняного кирпича" (г.Новолукомль) за 18 млн рублей. Однако деньги за котел "Госторг" перечислял дважды. По мнению следствия, прежде чем заключить договор с заводом, Смоленский приказал главбуху "Госторга" перечислить денежные средства в размере 50,544 млн рублей на счет предприятия "Сервистрейдюнион". Суд признал, что этот малоизвестный субъект хозяйствования не занимался хозяйственной деятельностью и не располагал каким-либо товаром, а также подтвердил доводы следствия о том, как была скрыта имитация сделки с "Сервистрейдюнион". Обвиняемые предоставили в бухгалтерию документы, признанные в настоящее время заведомо подложными. Если бы на "Госторге" не началась проверка финансово-хозяйственной деятельности в рамках уголовного дела, документы не вызвали бы ни у кого сомнения.

Небезынтересный факт: по данным милиции, поддельные документы были созданы силами сотрудников УП "Лекс", фактическим руководителем которого являлась Галина Крупченко. Имя этой дамы вот уже несколько лет известно правоохранительным органам страны. Летом 2005 года Крупченко была приговорена к 8 годам колонии за мошенничество и создание преступной организации, руководившей финансовыми структурами. В настоящее время Прокуратура РБ заканчивает работу по еще одному уголовному делу, в рамках которого обвиняется Крупченко.

Согласно документам, подготовленным с участием Крупченко, "Госторг" приобрел у "Сервистрейдюнион" котел за 50,5 млн. рублей. Эти деньги по распоряжению Смоленского были перечислены на счет предприятия-продавца, а затем обналичены с помощью Крупченко. Следствие посчитало, что Смоленский в наличной форме получил через компанию "Лекс" перечисленные "Госторгом" деньги, разделил их с Корольковым и присвоил. "Дырку" в бюджете "Госторга" закрыли без особых усилий: купленный в Новолукомле котел поставили на КУМПП ЖКХ "Микашевичское ЖКХ" за 80 млн рублей.

Александр НАДИШИН.
ej.by

ЧУЛІ?

Тры ў адным

Беларускі хакей у хуткім часе чакаюць рэформы. Пра гэта нядаўна паведаміў старшыня Федэрацыі хакея Уладзімір Навумаў.
У Мінску плануецца пакінуць толькі адзін прафесіянальны клуб.

Гэта звязана з тым, што беларускія хакейныя кіраўнікі дамовіліся з расійскім калегамі наконт таго, што беларускі клуб атрымае права выступіць у Вышэйшай лізе чэмпіянату Расіі.

Доўгі час мусіраваліся чуткі наконт таго, які менавіта клуб атрымае права прадстаўляць краіну ў чужым першынстве. Многія лічылі, што гэта будзе мінскае "Дынама" ля вытокаў адраджэння якога стаяў сам міністр унутраных спраў. Але Навумаў шакіраваў усіх навіной: у будучым сезоне ў беларускай сталіцы застанецца толькі адна каманда, створаная на базе трох, — "Кераміна", "Юнацтва" і "Дынама". Прычым "суперклуб", які будзе створаны шляхам "забойства" мінскіх клубаў, выступіць на два франты: і ў чэмпіянаце Расіі, і ў айчынным першынстве. Маўляў, кадравых праблем не ўзнікне, бо ў "суперкамандзе" будзе налічвацца пяць дзесяткаў высокакласных хакеістаў.

Назву будучай камандзе будзе прапанавана выбраць хакейным заўзятарам. З гэтай нагоды плануецца арганізаваць спецыяльнае галасаванне. Праўда, вялікую колькасць балельшчыкаў гэта не надта натхняе. Ужо выказваюцца меркаванні наконт памылковасці гэтага кроку. Аргументацыя простая — са стратай трох самабытных клубаў у першую чаргу згубіць унутраны чэмпіянат. Па-першае, скараціцца колькасць каманд-удзельніц, па-другое, цікавых матчаў у межах чэмпіянату Беларусі стане менш. Сярод балельшчыкаў ужо гучаць заклікі аб напісанні ў Федэрацыю хакея ліста, у якім плануецца аспрэчыць рашэнне вышэйшых хакейных чыноў.

Дарэчы, і не ўсе хакеісты выступаюць за аб'яднанне трох каманд у адну. Так, па просьбе "Народнай волі" сваё меркаванне выказаў адзін з вядучых хакеістаў нацыянальнай зборнай Беларусі, нападаючы мінскага "Дынама" Алег Антоненка: "Пра такі намер я чуў. Мне цяжка сказаць нешта на гэты конт — усё вырашыцца "наверсе". Але асабіста я не ўхваляю падобную ініцыятыву. Вы паглядзіце: на матчах мінскіх каманд трыбуны бітком забіты. Сустрэчы "Дынама", "Юнацтва" і "Кераміна" — заўжды цікавыя. Яны абмяркоўваюцца балельшчыкамі, пра іх гавораць. Стварыўшы адну каманду ў Мінску, страціць беларускі чэмпіянат. Але калі "суперклуб" усё ж такі створаны будзе, то я ўпэўнены, што яму па сілах выйграць турнір у Вышэйшай лізе і трапіць у "Суперлігу".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

КРЫЖАВАНКА

«Калядачкі»



Па гарызанталі: 5. Месца ў хаце, куды бацька кладзе лыжку куцці перад распачынаннем першай каляднай святочнай вячэры. 6. Час па Сонцы, калі тата або старэйшы сын прыносілі ў хату невялічкі ахапак сена, каб на яго паставіць гаршчок з куццёй. 11. Сімвалічны абрад у першую раніцу пасля "Шчадравання". 12. Глыбокая павага да Сына Божага. 15. Атрыбут каляднай варажбы хлопцаў аб ураджаі наступнага года. 16. Тэатралізаванае прадстаўленне калядоўшчыкаў. 17. Вялікая скрынка з векам і замком. Па прадпісанні продкаў, калі перад Ражаством Хрыстовым жанчына не дастане з яе новыя бялізну і строі, дык яна будзе цэлы год пустой. 20. Абраз, яго загадзя набываюць хлопцы для выканання святочна-абрадавага дзеяння на другі дзень Каляд (абыход па парадку ўсіх вясковых хат). 21. Сельскае паселішча, дзе строга выконваюцца ўсе калядныя традыцыі. 22. З песні калядоўшчыкаў: "Добры ... таму, хто ў гэтым даму". 25. Выпечаны хлеб пераважна круглай формы, ім гаспадыні накрываюць гаршчок з куццёй, які ставілі да заходу Сонца на покуці. 26. Пярэдняя галоўная частка будынка, што выходзіць на вуліцу, на ёй нашы продкі рабілі выяву васьміканцовай каляднай зоркі. 27. Накладка на твар, падобная на звярыную морду. Хто на Каляды хадзіў у ёй, абавязкова купаўся ў "Іардані" (крыжападобнай палонцы) пасля малення ў храмах на Вадохрышча. 28. Куцця (абл.). 33. Галоўная дзеючая асоба ў каляднай гульні "Жаніцьба Цярэшкі" - свацця — ... . 35. Гаспадарчая пабудова, гаспадар акрапляе яе асвечанай вадой перад тым, як сям'я сядзе за святочны стол 18 студзеня (апошні этап Калядаў). 40. Моцнае захапленне моладзі Магілёўшчыны ў час удзелу ў незвычайным святочным гулянні "Жаніцьба Бахіркі". 41. Гулянка дзяўчат і хлопцаў з музыкай і танцамі ў карчме або вялікай хаце пасля заканчэння абыходу вёскі. 42. З каляднай варажбы дзяўчат: "прыстасаванне для замыкання вядра" з калодзежнай вадой, пастаўленае дзвюма сяброўкамі ў хаце на лаву ўвечары, каб ноччу прысніўся ім той, хто прыйдзе "адамкнуць" гэтую пасудзіну. 45. Павелічэнне актыўнасці вясковых хлопцаў для выканання надзвычай сімвалічнага каляднага абрада - "засяванне". 46. Трэцяя галодная хрышчэнская куцця. 47. Што з дапамогай калядных варожбаў-прадказанняў імкнуліся пазнаць нашы продкі? 48. Адпаведным чынам прыгатаваная для святочнага стала на Шчадруху лапатачная частка тушы свінні.

Па вертыкалі: 1. Царкоўнае хрысціянскае свята нараджэння Хрыста, якое адзначаецца з 25 снежня па старым стылі і ў наступныя дні да Вадохрышча (ласк.). 2. Шост для каляднай дзявочай варажбы "Калодзеж мералі". 3. Прысмак з квашанай капусты, яго гаспадыня выносіла з кладоўкі калядоўшчыкам, пачуўшы іх песню. 4. Што павінен быў даць гаспадар калядоўшчыкам, каб цэнтральная фігура тэатралізаванага прадстаўлення "Каза ажыла" пачала скакаць, вясяліцца, дзякаваць за ветлівасць і шчырасць? 7. Каб быў добры будучы ўраджай у земляроба, хто ім запрашаўся есці куццю ў першую святочную калядную вячэру? 8. Гарэлка на свята (разм.). 9. Тлушч з ільну, на якім гатавалі стравы для поснай куцці. 10. Скамянелая смала хвойных дрэў, ужываецца для ўпрыгожвання. 13. Выканаўца роляў у вясковым калядным спектаклі. 14. Зімовая павозка на палазах, на ёй 8 студзеня бацькі нованароджаных катаюць бабку-павітуху. 18. Мочаны буйны жоўты яблык - ласунак на святочным стале. 19. Знакавая страва святочнай вячэры ў пярэдадзень старога Новага года - асаблівы спосаб падачы мяснога асарці з гарачай вострай падліўкай. 23. Хто акрамя жонкі ў першую калядную вячэру садзіўся за стол па правую руку бацькі? 24. У што апранаюць самага жвавага, рухавага, здольнага на ўсялякія штукарствы хлопца, які будзе ў час калядавання казой? 29. На другі дзень Каляд (8 студзеня) адзначаецца зімні... . 30. З каляднай песні: "Як я была ў свайго татачкі, ой, Калядкі! Па двары хадзіла - увесь двор Красіла. На ганку стала — ... зламала". 31. Картачная гульня "свой ...", за ёй шмат часу бавілі мужчыны ў калядныя вечары. 32. Удзельнік карнавальнага гурта ў калядную ноч (ласк.). 36. Драўляная, крыху звужаная ўверсе пасудзіна для заквашвання цеста на хлеб для свята. 37. Невялікі мызычны абрадавы твор, ён увесь час суправаджае Калядкі. 38. Устаноўлены парадак, спосаб жыцця, побыту, што мае цесную сувязь са структурай святочных абрадаў. 39. Незвычайныя ... — душы продкаў, яны наведваюць жывых на мяжы двух гадоў - старога і новага з пажаданнямі дабрабыту. 43. Хата, печ, парог, лазня - рытуальнае ... у структуры калядных абрадаў. 44. Рагавое ўтварэнне на канцы нагі ў каня лічылася, што ён не пазбівае яго, калі на Каляды (8 студзеня) папье вады "праз срэбра".

Ала АДАМАЙЦІС.

Адказы на крыжаванку, надрукаваную ў №№208—209

Па гарызанталі: 2.Ура! 3.Пліса. 6.Іта. 7.Гарэлка. 8.Ака. 13.Інаугурацыя. 14.Крыміналістка. 17.Дэмілітарызацыя. 20.Старонка. 22.Гантварг.

Па вертыкалі: 1.Архітэктура. 4.Ліра. 5.Сала. 9.Анты. 10.Гулі. 11.Сані. 12.Дыхт. 15.Маліна. 16.Сюзанэ. 18.Марат. 19.Цівун. 21.Ту. 23.Рэ. 24.Тост.

МІФЫ НАШАЙ ЗЯМЛІ

У Нясвіжы дзесяты год шукаюць 12 залатых апосталаў

Беларуская ўлада марыць знайсці казачныя скарбы Радзівілаў. Гэтым разам археолагі спецыяльна перакопваюць абарончы вал Нясвіжскага замка. Крапасныя ўмацаванні, пабудаваныя напрыканцы XVI стагоддзя італьянскім архітэктарам Джавані Бернардоні, нагадваюць парэзаны на кавалкі пірог. Археолаг Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Андрэй Мяцельскі атрымаў загад даследаваць патаемныя хады і адшукаць магчымыя сховы ў абарончым вале. І аб'ёмы працы землякопаў больш маштабныя, чым у рэстаўратараў.

Дарэчы, скарбы Радзівілаў шукаюць ад часу наведвання Нясвіжа Аляксандрам Лукашэнкам.

У 1997 годзе кіраўнік краіны наведаў горад і аддаў распараджэнне закрыць санаторый. З Мінска былі камандзіраваны археолагі і супрацоўнікі КДБ. Па крайняй меры, пра гэта ёсць запісы ў дзённіках знаўца гісторыі Нясвіжа Клаўдзіі Шышыгінай-Патоцкай. Пры жыцці яна занатавала, што археалагічна-кадэбісцкая экспедыцыя з металашукальнікамі выявіла падземны ход вышынёй 1,8 і шырынёй 1,2 метра. Таксама ў 1997 годзе ў Нясвіж наведалася яшчэ адна камісія. Яна нібыта даследавала на трываласць падмуркі і скляпенні фарнага касцёла. Але, паводле запісаў спадарыні Шышыгінай-Патоцкай, насамрэч шукалі схованкі з золатам.

Нарэшце замак, золата якога так і не знайшлі, быў перададзены 29 чэрвеня 2001 года на баланс Міністэрства культуры.

У тым жа 2001 годзе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы была пастаўлена п'еса "Чорная панна Нясвіжа". Дух яе гераіні Барбары Радзівіл нібыта папярэджвае аб надыходзячай бядзе. Гэта і здарылася 25 снежня 2002-га, калі пажар вынішчыў лепшую частку палаца. Дарэчы, у апошнія 70 гадоў палац не гарэў, нясвіжскія старажылы ня памятаюць нічога падобнага... Некаторыя кажуць, што пажар быў выкліканы менавіта пошукамі кладаў.

Міф пра нясвіжскі скарб — адзін з самых прыгожых у Беларусі. Вядома, што Радзівілы былі фантастычна багатыя. Нясвіж у 1511 годзе атрымаў Ян Радзівіл у пасаг за маладой жонкай з роду Кішак. Таксама ў XVI стагоддзі нямецкі імператар Карл V надзяліў магнацкі род графскім тытулам Святой Рымскай Імперыі. У часы Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі і Караля Станіслава Радзівіла Пане Каханку замак дасягнуў найвышэйшага росквіту.

Захаваліся вопісы, інвентар, акты, што сведчаць пра найвышэйшую канцэнтрацыю багаццяў у замку напрыканцы XVII стагоддзя. Тут захоўваўся амаль увесь дзяржаўны архіў Вялікага княства Літоўскага, напісаны на беларускай мове. Радзівілы мелі калекцыю старадаўняй зброі з Еўропы, тоны вырабаў з золата і срэбра.

Да нашага часу дайшлі звесткі пра 12 залатых фігур апосталаў у чалавечы рост, прывезеных з Канстанцінопаля. Існаванне іх не выклікае сумневу, бо бачылі многія сучаснікі. Ніводзін з Радзівілаў не прадаваў і не закладваў апосталаў. Яны былі пераканаы, што гэта абярэгі клана. Але на пачатку XIX стагоддзя 12 апосталаў таямнічым чынам зніклі. Тайну іх у магілу знёс у 1813 годзе Дамінік Радзівіл. На ім абарвалася і нясвіжская лінія роду Радзівілаў. І вось пошукі пачаліся з новай сілай...

Галіна БАРАВАЯ.
www.bulletinonline.org

ПАДЛІЧЫЛІ

Зелені не хапае

У большасці беларускіх гарадоў узровень забяспечанасці азеленымі тэрыторыямі агульнага карыстання адстае ад сучасных горадабудаўнічых патрабаванняў. Пра гэта на калегіі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя паведаміў начальнік спецінспекцыі Дзяржкантролю за выкарыстаннем і аховай зямель, расліннага свету, лясоў і ландшафтаў Уладзімір Саўчанка.

У адпаведнасці з горадабудаўнічымі патрабаваннямі ўзровень азеляненння ў межах забудаваных тэрыторый пасялення павінен быць не меншым за 40%, у межах тэрыторый жылой або змяшанай забудовы — не меншым за 25%. Вызначаецца ўзровень азеляненння як адносіны плошчы ўсіх азеленых тэрыторый да плошчы населенага пункта.

У Мазыры, Мінску і Чэрвені ўзровень азеляненння перавышае нарматыўныя паказчыкі (52,7%, 44% і 41,4% адпаведна). Але ў большасці беларускіх гарадоў гэты паказчык нізкі: у Віцебску — 17,2%, Оршы — 18,3%, Гродне — 20,4%, Слуцку — 16,3%, Брэсце — 15,5%, Гомелі — 19,2%, Жодзіне — 13,5%, Маладзечне — 19,4%, Жлобіне — 19,5%, Лідзе — 12,6%, Слоніме — 17,4%.

Пры гэтым за апошнія пяць гадоў плошчы азеляненння памяншаліся толькі ў Віцебскай і Мінскай абласцях, зазначыў У.Саўчанка.

Генадзь ШАРЫПКІН.

Сбудется, не сбудется...

Журнал Scienza & Paranormale ("Наука и паранормальные явления") собирает и тщательно проверяет предсказания, опубликованные в газетах, журналах, Интернете или объявленные по телевидению и радио. И как каждый год предъявляет огромнейший счет.

К числу наиболее грубых ошибок в 2006 году относятся предсказания о том, что две Кореи объединятся, Путин избежит покушения, которое будет раскрыто в самый последний момент, "2006 год самый удачный для политической карьеры Берлускони". Ничего из этого и другого не сбылось, пишет итальянская газета La Repubblika и продолжает: *"Самые легкомысленные ошибки допускаются астрологами в мире светских сплетен. К числу немногочисленных сбывшихся прогнозов можно отнести легко предсказуемое рождение второго ребенка у футболиста Тотти. Но что касается всего остального, то у Берлускони должна была начаться новая большая любовь, а у журналистки Кристины Пароди — новый любовный кризис в конце июля. "Мисс Италия" должна была стать красавица, родившаяся под знаком Скорпион, но в действительно этот титул присужден девушке-Овну. Актрисе Марии Джованне Элми предсказывали "большие успехи, связанные с кулинарией".*

Специалист в этой области Массимо Полидоро говорит: *"Становится еще более очевидным, что большая часть предсказаний в действительности настолько банальны или неопределенны, что трудно судить, правильные они или ошибочные".*

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Для тых, хто спазніўся...

Так і ведалі: надыдзе студзень, а многія будуць тэлефанаваць: "Не паспелі зрабіць **перадаплату,** дапамажыце..."

Што ж, шаноўныя, спецыяльна для Вас у першых нумарах 2007 года друкуем узоры плацежкі і абаненцкай карткі.

Каб зрабіць **перадаплату** за студзеньскія, лютаўскія і сакавіцкія нумары (а можна адразу і за нумары ўсяго паўгоддзя), **тэрмінова** наведайце любы філіял "Беларусбанка", а там, дзе іх няма, — любое паштовае аддзяленне. Мінчане могуць аператыўна зрабіць **перадаплату** праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 206-63-93 ці 206-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашыя валанцёры з новымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін.

Нагадваем: сума **перадаплаты** за месяц ранейшая — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм (за два месяцы адпаведна 19.000 і 30.000 рублёў). Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

У чарговы раз звяртаем увагу на тое, што перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую **АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ,** узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары. Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі.

Разумеем: для Вас, шаноўныя чытачы, гэта дадатковыя цяжкасці. Але што зробіш: каб Вы своечасова атрымлівалі газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

Вы — з «Народнай воляй», «Народная воля» — з Вамі!

0402280179
ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

КВИТАНЦИЯ
Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операций по уплате налогов

Абонентская карточка
на номера газеты «Народная воля»
за за январь, февраль, март, апрель, май, июнь 2007 года
(ненужное зачеркнуть)

Заполняется отчетливо печатными буквами и обязательно отправляется в редакцию с копией платежного документа

фамилия
имя **отч.**
индекс почтового отделения
область
район
название населенного пункта
город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)
улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*
дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

Шаноўныя чытачы «Народнай волі»!

Аўтар і аргкамітэт па правядзенні прэзентацыі літаратурнага твора — трылогіі Васіля Якавенкі "ПАКУТНЫ ВЕК" сардэчна віншуюць Вас і Вашы сем'і з Новым 2007 годам і Калядамі. Здароўя! Шчасця!

Паведамляем тым часам, што прэзентацыя кнігі "Пакутны век" адбудзецца 17 студзеня 2007 года ў памяшканні Дома літаратара (Мінск, вул. Фрунзе, 5). Пачатак а 18-й гадзіне.

Запрашаем Вас і Вашых блізкіх, сяброў і знаёмых на гэтую вечарыну.

Кантактны тэлефон/факс 294-03-48.
E-mail: yakavenka@list.ru

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 206-68-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 206-69-04, 206-69-06.
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info
Індэкс 63222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай.

Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 3.01.2007 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 11 000 экз. Заказ №